WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЖНІЎНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 166
(26774)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

У РЫЖСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ БУДУЧЫНЯ ЁСЦЬ!

Транспартная калона з абсталяваннем для беларускай школы ў Рызе адправілася ўчора з беларускай сталіцы.

Рыжская асноўная беларуская школа была створана ў 1994 годзе па ініцыятыве беларускага таварыства «Світанак» і Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвіі. Сёння тут навучаюцца 115 чалавек і яшчэ 15 дзетак займаюцца ў падрыхтоўчым класе. 70 працэнтаў ад агульнай колькасці вучняў з'яўляюцца этнічнымі беларусамі. Зразумела, што беларуская мова і літаратура з'яўляюцца абавязковымі прадметамі для выкладання ў беларускай школе. На беларускай мове праводзяцца і ўсе пазакласныя мерапрыемствы.

Сёлета для Рыжскай беларускай школы ў латвійскай сталіцы былі выдзелены два паверхі ў будынку сярэдняй школы № 86 з асобным уваходам. За сродкі муніцыпалітэту там быў зроблены рамонт і заменены вокны. А вось пра «начынне» для школы паклапаціліся ў Беларусі. Па даручэнні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі Рыжскай беларускай школе будуць перададзеныя аўтобус, абсталяванне для харчовага блока і кабінетаў фізікі, хіміі, біялогіі, працы, замежных моў, мэбля для класаў і дапаможных памяшканняў, камп'ютарная і аргтэхніка, спартыўны рыштунак, вучэбна-метадычная літаратура, дываны, шторы, інвентар для ўборкі тэрыторыі, а таксама цацкі і настольныя гульні, вырабы народных майстроў і іншыя прадметы для арганізацыі навучання, выхавання і адпачынку дзяцей. Да камплектавання транспартнай калонны далучыліся міністэрствы адукацыі, прамысловасці, спорту і турызму, культуры, канцэрны «Беллеспаперапрам», «Беллегпрам», абласныя выканаўчыя камітэты і Мінскі гарвыканкам.

Кіраўніцтва Рыжскай беларускай школы спадзяецца, што пераезд у новае памяшканне дазволіць ператварыць асноўную школу (з I па IX класы) у сярэднюю (з I па XI класы), а гэта, у сваю чаргу, павялічыць колькасць ахвотных атрымліваць тут адукацыю.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Анатоль РУБІНАЎ:

«ВЫНІКІ ЦТ — ГЭТА РЭАЛЬНАЯ АЦЭНКА ЎЗРОЎНЮ ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ»

Сёлета ўпершыню падчас правядзення прыёмнай кампаніі ў краіне не было выяўлена сур'ёзных карупцыйных парушэнняў. Пра гэта паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і ССНУ ў 2010 годзе Анатоль РУБІНАЎ. Да кантролю за ходам прыёмнай кампаніі былі прыцягнутыя па краіне амаль 3 тысячы чалавек, у тым ліку 214 работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Паводле слоў Анатоля Рубінава, каб цалкам ліквідаваць глебу для карупцыі, усе экзамены для абітурыентаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія паступаюць на аснове базавай адукацыі, у будучым годзе могуць прайсці ў пісьмовай форме, прычым па цэнтралізаваных заданнях, падрыхтаваных спецыялістамі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, у вызначаныя Міністэрствам адукацыі дні. Гэтая прапанова ўтрымліваецца ў справаздачы па выніках работы дзяржкамісіі на імя кіраўніка нашай дзяржавы.

У бягучым годзе сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ўпершыню праводзілі свае пісьмовыя ўступныя іспыты па цэнтралізаваных заданнях. Быў распрацаваны і зацверджаны поўны алгарытм дзеянняў, скіраваны на ахову канфідэнцыяльнасці інфармацыі: ад моманту дастаўкі экзаменацыйных матэрыялаў у навучальную ўстанову, іх захоўванне да распячатвання канвертаў і тыражавання заданняў. Аднак многія з сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў аддалі перавагу вусным іспытам, гэта значыць, пакінулі магчымасць для пэўных манеўраў.

СТАР. 2

Наталля ПЯТКЕВІЧ:

Блізкая ўлада

«Кардынальных змяненняў у нарматыўна-прававой базе па рабоце са зваротамі грамадзян не патрабуецца»

Фота БЕЛТА.

Кардынальных рашэнняў па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы Беларусі па рабоце са зваротамі грамадзян не патрабуецца. Такую думку выказала журналістам падчас асабістага прыёму грамадзян **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля ПЯТКЕВІЧ**, адказваючы на пытанне карэспандэнта **БЕЛТА**. Прыём праводзіцца ў рамках трэцяга этапу маніторынгу работы органаў мясцовай улады з насельніцтвам.

Паводле слоў Наталлі Пяткевіч, у рэспубліцы праводзіцца каласальная работа па разглядзе зваротаў грамадзян. На постсавецкай прасторы такой нарматыўна-прававой базы, як у Беларусі, больш нідзе няма, і многія іншыя краіны пераймаюць беларускі вопыт. «Мы ў многім былі піянерамі ў гэтым пытанні. Зроблена шмат усяго, створана добрая заканадаўчая база, дзе напісана так, як павінна быць. Цяпер размова ідзе аб выкананні», — сказала Наталля Пяткевіч.

Яна звярнула ўвагу на тое, што нават пры наяўнасці нейкіх недахопаў назваць работу старшынь рай- і гарвыканкамаў або аблвыканкамаў дрэннай нельга. Кіраўнікі таксама могуць не ведаць усіх існуючых праблем. «Гэта работа ўсіх нас адначасова, каб разам вырашаць агульную для нас задачу», — дадала Наталля Пяткевіч.

Як падкрэсліла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, праводзімы маніторынг паказаў, што глабальных і сур'ёзных праблем, якія негатыўна характарызавалі б эканамічную сітуацыю ў краіне, няма. Тыя пытанні, з якімі людзі звяртаюцца, сведчаць аб даверы да ўлады. Нават ёсць падзячныя водгукі аб рабоце службаў.

Наталля Пяткевіч падкрэсліла, што такі маніторынг не нейкая аднаразовая акцыя, а пастаянная работа. «Адным з першых крокаў Прэзідэнта, калі ён быў выбраны ў 1994 годзе, стала стварэнне яго распараджэннем такіх рабочых груп, якія выязджалі па рэгіёнах і вялі прыём грамадзян для маніторынгу праблем. І гэта работа пастаянна праводзіцца на працягу ўжо многіх гадоў, але не заўсёды гэта работа асвятляецца», — адзначыла Наталля Пяткевіч.

Яна дадала, што не ўсе праблемы ўдаецца вырашыць адразу, але галоўнае — гэта тое, каб праблемы былі пачуты і па іх быў дадзены канкрэтны адказ. Часта гэтага не адбываецца, паколькі не кожны на сваім месцы добрасумленна ставіцца да выканання сваіх абавязкаў.

Учора на прыёме да першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярталіся ў асноўным па пытаннях работы жыллёва-камунальных службаў — яны датычыліся добраўпарадкавання дваровых, вывазу смецця, асвятлення вуліц, забеспячэння транспартнага, гандлёвага абслугоўвання, вырашэння праблемы падтапленняў участкаў і працякання дахаў. Па многіх пытаннях былі дадзены канкрэтныя даручэнні, некаторыя патрабавалі дадатковага разбору.

Наталля Пяткевіч лічыць неабходным зрабіць больш жорсткай адказнасць службовых асобаў за бюракратызм і валакіту. Аб гэтым яна заявіла журналістам па выніках асабістага прыёму грамадзян.

СТАР. 2

Не народ да ўлады, а ўлада — да народа

У працаўнікоў БелАЗа ўчора быў асаблівы дзень: не ім давялося шукаць сустрэчы з уладай, каб вырашыць сваю праблему, а ўлада прыйшла да іх. У асобе Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ, спікера Палаты прадстаўнікоў і ўпаўнаважанага прадстаўніка Прэзідэнта па Мінскай вобласці. На галоўным прадпрыемстве Жодзіна ён правёў прыём грамадзян у рамках чарговага этапу маніторынгу, які дапаможа ацаніць работу мясцовай улады з насельніцтвам.



Фота БЕЛТА.

На БелАЗе каля 12 тысяч працаўнікоў — лічы, кожны пяты гараджанін зарабляе на жыццё тут. Таму кола акрэсленых імі праблем дае ўяўленне пра гарадскую сітуацыю ў цэлым. Ахвотных задаць пытанне дзяржаўнаму дзеячу нямала. Праблему з электрыфікацыяй дачнага ўчастка спадзяецца вырашыць на сённяшнім прыёме Наталля Граблюк. Інжынер-тэхнолаг Аляксандр Клімец непакоіцца за дачку, у якой узніклі цяжкасці з атрыманнем матэрыяльнай дапамогі па выплаце жыллёвага крэдыту...

— Я чула, што будзе грашовая падтрымка шматдзетным сем'ям, калі двое дзяцей ідуць у школу. У мяне трое дзетак, аднаго сёлета трэба сабраць у першы клас, другога — у восьмы, — дзеліцца з намі Анжэліка ЖУГАРАВА, якая да дэкрэта працавала на БелАЗе токарам аўтаматнага цэха. — А ў тэрытарыяльным цэнтры (сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. — **Аўт**.) сказалі, што гэта толькі для сем'яў, у якіх чацвёра дзяцей і больш. Вось я і хачу праўды дабіцца, хіба трое — гэта не шматдзетная сям'я, ёй дапамога не патрэбная?..

Праблему шматдзетнай маці абяцалі вырашыць на ўзроўні гарвыканкама. Матэрыяльная падтрымка такім сем'ям будзе аказаная, як плануецца, за кошт сродкаў прадпрыемстваў. Эфект у наяўнасці! Увогуле ж усе прыватныя гісторыі разам акрэсліваюць агульныя «трывожныя» зоны — ЖКГ, будаўніцтва, сацыяльная падтрымка — і даюць арыенціры для ўлады.

Так, у Жодзіне сёння чарга на жыллё ў 2,3 тысячы чалавек, і варта шукаць магчымасці паскарэнне будаўніцтва. Многае возьмуць на заметку і заканадаўцы. Усё пачутае прыдасць ў рабоце над праектам закона аб зваротах грамадзян, які цяпер знаходзіцца ў Палаце прадстаўнікоў.

— Ён уводзіць такія новыя нормы, як разгляд калектыўных, паўторных, ананімных скаргаў, электронных зваротаў. Таксама ўводзіцца права грамадзян на пісьмовыя звароты да індывідуальных прадпрымальнікаў. Стане магчымым весці прыём грамадзян з аўдыё- і відэазапісам. Важна тут, унізе, адчуць, як змогуць працаваць гэтыя нормы, — рэзюмуе кіраўнік ніжняй палаты парламента.

Ды і многія акрэсленыя жодзінцамі праблемы маюць быць знятыя на заканадаўчым узроўні. Сярод такіх Уладзімір Андрэйчанка назваў праблему са страхавымі выплатамі яшчэ з савецкіх часоў:

— Гэта больш за два мільёны заключаных дагавораў, і патрэбна больш за трыльён рублёў, каб разлічыцца з людзьмі, — абазначае маштаб праблемы спікер.

— Падчас прыёму я не пачуў напружанасці, нездаволенасці. Пераважна ўсё гэта жыццёвыя пытанні. Махровага бюракратызму, калі б пытанні не вырашаліся, я не заўважыў.

Сваю порцыю інфармацыі атрымала і кіраўніцтва завода.

— Мы, як парламентарыі, якім даводзіцца праводзіць міжнародныя сустрэчы, можам сцвярджаць, што замежныя партнёры прадпрыемства часцяком падымаюць пытанні сэрвіснага абслугоўвання, лізінгавых продажаў. Гэтыя заўвагі прадпрыемству сёння выказаныя, — адзначае Уладзімір Андрэйчанка.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Украіна будзе дабівацца перагляду газавага дагавору з Расіяй

Формула кошту на расійскі газ, нягледзячы на атрыманую зніжку ў 100 долараў за тысячу кубаметраў, па-ранейшаму нявыгадная для Украіны, і Кіеў будзе прасіць у Расіі перагледзець яе.

Як заявіў у Кіеве прэм'ер Украіны Мікалай Азараў, па «кабальнай» дамове, складзенай у студзені 2009-га, «кошт на газ вызначаўся па формуле, якая прадугледжвала штоквартальнае яго павышэнне». «Так, у першым квартале бягучага года мы атрымалі газ па 330 долараў за тысячу кубаметраў і штоквартальна кошт павялічваўся прыкладна на 25 долараў. Гэта значыць, у 4 квартале ён будзе складаць каля 390 долараў за тысячу кубаметраў», — цытуе Азарава «Украінская праўда».

«Гэтая формула працягвае дзейнічаць. Гэта факт, які немагчыма аспрэчыць. Такі кошт азначаў бы катастрофу для эканомікі і народа Украіны», — падкрэсліў Азараў.

«Мы ставім за мэту перагледзець вельмі нявыгаднае для Украіны пагадненне з РФ і настойліва будзем пераконваць нашых расійскіх партнёраў у неабходнасці гэта зрабіць», — падкрэсліў прэм'ер.

«Новая газета» распавяла пра кланы ў ФСБ: «піцерскія», «блатныя», «развадзілы» і «крышавацелі»



Федэральная служба бяспекі, як любая дзяржаўная структура, уяўляе сабой складаны механізм, у якім сутыкаюцца інтарэсы розных кланаў, змяляцтваў і груп, сцвярджае «Новая газета». Як высветліла выданне, сярод кланаў у ФСБ ёсць «піцерскія», «блатныя», «развадзілы», «крышавацелі» і «рабацягі».

У наш час на чале структуры стаяць піцерскі клан і людзі, блізкія да былога дырэктара ФСБ, сакратара Савета бяспекі Мікалая Патрушава. З клана «піцерскіх» як дырэктар ФСБ Аляксандр Бортнікаў, так і амаль усе яго намеснікі.

Да клану «блатных» належаць тыя супрацоўнікі ФСБ, якія патрапілі на службу пры дапамозе сваякоў — генералаў ці высокапастаўленых чыноўнікаў. Па назіранні «Новай газеты», такія чэкісты звычайна праз некалькі гадоў перабіраюцца на больш прыбытковыя месцы ў буйныя банкі і нафтавыя кампаніі. Як піша газета, самым яскравым прыкладам могуць служыць сыны Патрушава — Дзмітрый і Андрэй.

Патрушавы-малодшыя з'яўляюцца выпускнікамі Акадэміі ФСБ. У маі старэйшы сын Патрушава Дзмітрый узначаліў «Рассельгасбанк». Раней 32-гадовы Патрушаў працаваў старшым намеснікам старшыні банка ВТБ. Малодшы Андрэй у 2006 годзе быў прызначаны дарадцам старшыні рады дырэктараў «Раснафты».

Яшчэ адзін клан — «крышавацелі». Галоўным чынам прадстаўнікі гэтага клана прасунуліся па кар'ерных лесвіцах самі, за кошт чэкісцкіх «дахаў». «Крышавацелі» падзяляюцца на некалькі катэгорый. Некаторыя ўдзельнічаюць у сходках нароўні з бандытамі, вырашаюць канфлікты з удзелам карумпаваных супрацоўнікаў МУС і чыноўнікаў, абараняюць кампаніі ад фінансавых праверак.

Іншыя прадстаўнікі клана толькі атрымліваюць хабары за тое, што прыкрываюць якую-небудзь незаконную дзейнасць. Па звестках выдання, «крышавацелі» пакрываюць тых, хто займаецца кантрабандай, наркотыкамі і нелегальнымі прыбыткамі. Ёсць нават такія чэкісты, якім бізнэсмены плацяць на ўсякі выпадак у разліку, што калі-небудзь яны спатрэбяцца.

Клан «вымагальнікаў» яшчэ больш шматлікі, чым папярэднія. Паводле інфармацыі крыніцы газеты, расійскія суды цяпер проста заваленыя крымінальнымі справамі, дзе ў якасці вымагальнікаў фігуруюць супрацоўнікі ФСБ. Чэкісты спрабуюць адбіраць бізнэс, а таксама вымагаюць грошы і машыны пры любой нагодзе.

Дабрабыт клана «развадзілаў» заснаваны на традыцыйным страху расіян перад УЧК-КДБ-ФСБ. Часцей за ўсё прадстаўнікі гэтага клана служаць дробнымі оперупаўнаважанымі ці тэхнічнымі спецыялістамі. Яны запалохваюць даверлівую ахвяру, якая праз некаторы час гатовая выкласці грошы.

Нагадаем, што Федэральная служба бяспекі выконвае задачы па забеспячэнні бяспекі Расійскай Федэрацыі. Па законе кіруе дзейнасцю ФСБ прэзідэнт.

У Туркменіі завершаны дэмантаж 12-метровай статуі Ніязава



Пазалочаная статуя першага прэзідэнта Туркменіі Сапармурата Ніязава, больш вядомага як Туркменбашы, перастала быць самай яркай візітнай карткай Ашхабада. Учора завяршыўся яе дэмантаж на вяршыні 75-метровай «Аркі нейтралітэту», якую перш упрыгожвала 12-метровая постаць першага прэзідэнта, які кіраваў краінай з 1991 па 2006 гады.

Менавіта пры ім у снежні 1995 года была прынята гістарычная для Туркменіі рэзалюцыя ААН, якая пацвярджае нейтральны статус дзяржавы. Да свята Дзень нейтралітэту (12 снежня) знікне з цэнтральнага пляца краіны і сама арка, якая стаіць на трох апорах і сімвалізуе агмень. Упершыню пра рашэнне дэмантаваць «Арку Нейтралітэту» і пабудаваць іншую дзейны прэзідэнт Гурбангулы Бердымухамедаў абвясціў у 2008 годзе. Да гэтага часу ўжо знікла згадванне Туркменбашы ў дзяржаўным гімне і патрыятычнай клятве. Зніклі з вуліц шматлікія партрэты Ніязава і бюсты ў будынках дзяржаўных арганізацый і ўстаноў. Месяцу студзеню, названаму пры Ніязаве «Туркменбашы», вярнулі назву грыгарыянскага календара. У святочны каляндар вярнуўся Жаночы дзень — 8 сакавіка, які пры Ніязаве адзначаўся ў дзень нараджэння яго маці. Сярэднія школы зноў сталі 10-годкамі (былі 9-годкі), а тэарэтычны курс у ВНУ падоўжыўся з двух да пяці гадоў.

200 ДОЛАРАЎ — НІЖНЯЯ ПЛАНКА

Урад плануе павялічыць зарплаты некаторым катэгорыям бюджэтнікаў ужо з 1 верасня

ПЛАНЫ па павелічэнні заробкаў будуць выкананыя — да канца года іх сярэдні па краіне ўзровень складзе 500 долараў у эквіваленце. Прычым, як адзначыў падчас сустрэчы з прафсаюзамі прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, гэта будзе зроблена не дырэктыўнымі метадамі, а за кошт унутраных рэзерваў прадпрыемстваў і арганізацый — дзякуючы зніжэнню выдаткаў вытворчасці. У прыватнасці, пралічана: толькі скарачэнне выдаткаў матэрыялаёмістасці на 1-2 працэнты па прамысловасці можа забяспечыць рост заробкаў у гэтай сферы адразу на 20-40 працэнтаў.

Новыя рынкі і ўласнае паліва

Эканоміка Беларусі традыцыйна зарыентаваная на экспарт. І ў сувязі з гэтым не адчуць наступствы сусветнага фінансавага крызісу мы проста не маглі. Летась рост ВУП прыкметна замарудзіўся. Але, у адрозненні ад большасці суседніх краін, не пайшоў «у мінус», што дазволіла не згарнуць сацыяльныя праграмы.

— Мы сталі актыўна працаваць на знешніх рынках і ў тым ліку, не сакрэт, выкарысталі тут пэўную разгубленасць асобных краін, — заўважыў Сяргей Сідорскі. — Прычым напружаная работа працягвае прыносіць вынікі: за студзень—ліпень сёлета рост ВУП склаў 107 працэнтаў, і ёсць усе падставы сцвярджаць, што мы выйдзем на прагнозныя паказчыкі ў цэлым па годзе. Такім чынам, даводзіцца канстатаваць: аднаўленне эканамічнага росту стала паўсюднай рэаліяй.

Ці не галоўнае пытанне — энергетычная бяспека. Змяненне ўмоў паставак вуглевадародnай сыравіны з Расіі, зноў жа, падштурхнула да пошуку новых шляхоў. Адным з іх стала стаўка на энергазбяражэнне. На працягу 2006—2011 гадоў энергаёмістасць валавога прадукту мае зменшыцца як мінімум на 30 працэнтаў. А задача на наступную пяцігодку — паказчык у 50 працэнтаў.

— У Беларусі з'явіцца больш за 160 цеплавых электрастанцый на мясцовых відах паліва, і мы станем спажываць менш газу, — паведаміў Сяргей Сідорскі. — А з улікам уводу ўласнай АЭС, які запланаваны на 2016 год, у цэлым спажыванне знешніх крыніц «змінусуе» на 45—50 працэнтаў.

Аднак не менш актуальная тэма — дыверсіфікацыя знешніх паставак энергіі. У прыватнасці, варта нагадаць: у гэтым плане вядзецца работа па праектах з Венесуэлай і Іранам.

Знешняя сальда выйдзе на нуль

Як заўважыў прэм'ер-міністр, Беларусь перажыла буйную мадэрнізацыю. За апошнія пяць гадоў у краіне з'явілася больш за 180 новых прамысловых прадпрыемстваў, айчынная прамысловасць удасканаліла больш за тысячу тэхналагічных працэсаў. Прычым гэтая работа працягнецца. Апроч такіх «базавых» галін, як аўтамабілебудаванне, сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне ці электратэхнічная вытворчасць, будзе надавацца асаблівая ўвага і іншым напрамкам з высокай дадanай вартасцю — нанатэхналогіі, біятэхналогіі, лазернай тэхналогіі. Да таго ж у наступныя пяць гадоў мяркуецца рэалізаваць не менш чым па 25 буйных інавацыйных праектаў у кожнай вобласці і не менш чым 50 буйных інавацыйных праектаў — на ўзроўні дзяржавы.

— Сапраўды, вывесці на перадавы тэхналагічны ўзровень усіх і адразу немагчыма, але факт застаецца фактам: за сцісы адрэзак часу валавы ўнутраны прадукт краіны ўзрос на 267 працэнтаў — такога выніку не мае ніводная постсавецкая краіна, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — Аднак планы на наступныя пяць гадоў не менш напружаныя — мы павінны прыбавіць яшчэ 168 працэнтных пунктаў.

Пры гэтым сёння стаіць задача: за кошт імпартазамяшчэння, змяншэння выдаткаў па імпарце і павелічэння экспарту ўжо ў 2013 годзе сальда знешняга гандлю Беларусі павінна выйсці на нуль.

З аглядкай на сусветны рэйтынг

Яшчэ адна з прыкмет ажыўлення — захаванне нізкага ўзроўню беспрацоўя (па выніках года ён не павінен перавысіць 1-1,2 працэнта) і павелічэнне колькасці занятых у айчыннай эканоміцы. У сваю ж чаргу яе рост павінен прывесці да паляпшэння якасці жыцця. І ў гэтым плане ёсць не менш цікавая мэта: за наступныя пяць гадоў Беларусь павінна ўвайсці ў лік першых 50 краін свету па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу. Пакуль у спісе з больш чым 180 краін, дзе адсочваецца такі паказчык, мы займаем 69 радок.

Рост без далейшага падзення

Зразумела, што заробкі — справа зусім не апошняя. Апроч 500 долараў па выніках года ў цэлым па краіне тут існуе не менш важная мэта — у рэальным сектары эканомікі не павінна застацца арганізацый з сярэднім узроўнем аплаты працы ніжэй за 200 долараў у эквіваленце. Разам з тым Сяргей Сідорскі падкрэсліў: любы рост заробкаў павінен быць эканамічна абгрунтаваным. І варыянт, калі сёння зарплата расце, а заўтра зніжаецца, з'яўляецца абсалютна непрымальным.

Што ж да невытворчай сферы, то планы тут наступныя. Сёння ўрад выходзіць з прапановай павялічыць з 1 верасня тарыфныя стаўкі ці аклады некаторым катэгорыям бюджэтнікаў: маладым спецыялістам, педагагічным работнікам (за выключэннем прафесарска-выкладчыцкага складу), урачам дзяржаўных арганізацый, работнікам устаноў сацыяльнага абслугоўвання і работнікам культурна-асветніцкіх устаноў — пры ўмове, што яны займаюцца асноўным відам дзейнасці.

Другое ж павелічэнне бюджэтных заробкаў запланавана на лістапад. Такім чынам, па выніках года сярэдняя зарплата па бюджэтнай сферы павінна выйсці на агульную лічбу ў 410 долараў. Пры гэтым зноў жа чакаецца, што ў краіне не застанецца бюджэтных арганізацый з сярэдняй зарплатай менш за 200 «умоўных адзінак».

Прывабны крэдыт — і сярэдняму гораду

Як падкрэсліў Сяргей Сідорскі, сярод прыярытэтаў у будучыні застанецца жыллё. Аб'ём яго будаўніцтва павялічыцца ў 1,8 раза, і стаўка тут будзе рабіцца на «квадратныя метры» для чаргавікоў.

Дарэчы, паведаміў прэм'ер-міністр, сёння ўрад выступае з прапановай аблегчыць для чаргавікоў умовы крэдытавання. Прапануецца вызначыць, што магчымасць атрымліваць ільготныя крэдыты пад 1 працэнт гадавых у тым ліку павінны мець жыхары сярэдніх гарадоў — з насельніцтвам да 50 тысяч жыхароў.

За шкоднасць — пуцёўка?

На слыху — і тэма аздараўлення. За апошнія пяць гадоў якасць айчынных санаторыяў значна палепшылася, толькі Федэрацыя прафсаюзаў правяла мадэрнізацыю адразу 15 будынкаў, якія практычна прыходзілі ў заняпад. І паралельна ў здраўніцах у некалькі дзесяткаў разоў павялічылася колькасць медыцынскіх і забаўляльных паслуг. Як вынік, попыт на пуцёўкі рэзка ўзрос. Аднак таксама не сакрэт: у «высокі сезон» ці не палова месцаў у здраўніцах выкупляецца замежнымі грамадзянамі. У той час як грамадзяне нашай краіны сутыкаюцца з праблемай дэфіцыту.

Між тым, у сувязі з гэтым Федэрацыя прафсаюзаў зноў выступае з ранейшай ініцыятывай: замацаваць норму, паводле якой будзе прадастаўлена права як мінімум на 12-дзённае аздараўленне ў санаторыях грамадзянам, якія працуюць у шкодных умовах. Прычым, на думку Сяргея Сідорскага, гэта прапанова вартая разгляду — у прыватнасці, у якасці аднаго з варыянтаў тут будзе вывучана магчымасць забеспячэння пуцёўкамі работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах, за кошт прадпрыемстваў.

Інвестар і прафкам не канкурэнты?

Адначасова ўзнікае і іншае пытанне. Зразумела, што мадэрнізацыя айчыннай эканомікі не абыдзецца без раздзяржаўлівання прадпрыемстваў і прыходу на іх прыватных інвестараў. Ці не прывядзе гэта да знікнення на такіх прадпрыемствах прафкамаў?

— На жаль, у нас быў прыклад мотавелазавода, дзе новы гаспадар паспрабаваў фактычна разбурыць прафкам, разбіць яго на некалькі частак і тым самым ліквідаваць «нязручнага» сацыяльнага партнёра, — заўважае старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік. — Таму давялося ўмешвацца ў гэтую справу. Бо не сакрэт: са знікненнем прафкама знікаюць і сацыяльныя гарантыі работнікам.

З улікам гэтага ФПБ выступае з ініцыятывай прыняць спецыяльны нарматыўны акт, які вызначыць: інвестар, які прыходзіць на прадпрыемства, будзе абавязаны захаваць прафкам прынамсі ў першыя гады сваёй дзейнасці. Прычым Леанід Козік перакананы, што падобнае рашэнне тых жа інвестараў не адштурхне.

— Інвестар ідзе не туды, дзе бязладдзе, а туды, дзе ёсць дысцыпліна, — адзначыў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў. — А падтрымаць дысцыпліну і парадак можа дапамагчы менавіта прафкам.

Сяргей ГРЫБ.

«А ВОСЬ КАМУ «ДА́ЧКА»? ПЛЫВУЧАЯ! ЗА $60 ТЫСЯЧ!»

РУП «Гомельскі суднабудаўнічы суднарамонтны завод» выступае ініцыятарам інвестпраекта «Арганізацыя вытворчасці малых суднаў і плывучых канструкцый». Ён, у прыватнасці, мае на ўвазе будаўніцтва базавага катара-платформы, прагулачна-экскурсійнага катара, плывучай дачы, суднаў спецыяльнага прызначэння. У якасці рынкаў збыту разглядаецца як унутраны, так і рынкі блізкага замежжа, дзе ёсць разгалінаваная гідраграфічная сетка. Падрабязнасці карэспандэнту «Звязды» раскрыў кіраўнік прадпрыемства Уладзімір ВАСІЛЕЦ.

Падобныя дамы-лодкі карыстаюцца вялікай папулярнасцю на Захадзе.

— За базавую мадэль ці, інакш, платформу мы прапануем узяць катар даўжынёй 15-16 метраў, максімум да 20 метраў. На яго аснове можна будзе выраблять, напрыклад, прагулачны катар на два-чатыры чалавекі: абсталяваць навесам, зрабіць каюты. А можна будзе выпускаць плывучую дачу з усімі выгодамі, якія пажадае мець кліент. Бачылі ж такія ў сюжэтах з замежжа? Парыбачыў на адным возеры, потым паплыў на другое, у дарозе прыстаў да берага, пажыў нейкі час, калі захацеў. Можна выпускаць і судна-паром, абсталяванае пляцоўкай для перавозкі аўтамабіля. Такая вось ідэя ўвогуле.

— А куды на зіму такую плывучую дачу можна будзе паставіць? Ці можна будзе на ёй жыць увесь год?

— Ну, увесь год можа і не — уцяпляць жа тады судна трэба. А паставіць на захоўванне яе можна на лодачную станцыю, пад ахову.

— І як, думаеце, запатрабаванымі будуць такія судны?

— Так, асабліва ў кантэксце развіцця водна-транспартнай галіны, водна-рэкрыацыйнага турызму ў краіне. Як вы ведаеце, стварэнне водных турыстычных маршрутаў, берагавой і плывучай інфраструктуры, будаўніцтва пасажырскіх суднаў і плавальных сродкаў прадугледжанае нацыянальнай праграмай развіцця турызму ў краіне.

— Гэта вы пра юрыдычных асобаў найперш. А грамадзяне, як мяркуеце, змогуць адважыцца на набыццё такой вось «дачкі»? Колькі яна, дарэчы, можа каштаваць?

— Чаму б не?! Думаю, будуць купляць судны і фізічныя асобы, прыватнікі. Мяркуем, што кошт плывучай дачы будзе ад 60 тысяч долараў і вышэй — у залежнасці ад запатрабаванняў кліента па яе аздабленні. Так, гэта кошт трох добрых аўтамабіляў. Аднак, па-першае, у нас таксама ёсць нябедныя людзі, па-другое, замежныя аналагі «стартуюць» ад 100 і больш тысяч долараў.

— А дзе прадукцыя яшчэ можа быць запатрабаванай найперш? Ці ёсць ужо патэнцыйныя інвестары?

— Калі пра рынкі збыту, дык гэта найперш можа быць Украіна, з якой у нас агульная водная артэрыя, Расія. А яшчэ краіны Балтыі. А наконт інвестараў скажу, што зараз цікаўнасць да праекта праявілі дзве кітайскія фірмы.

...У Міністэрстве транспарту і камунікацый упэўненыя, што наяўнасць больш як 10 тысяч азёраў і 20 тысяч рэк сведчыць пра вялікі патэнцыял развіцця ў Беларусі водна-рэкрыацыйнага турызму. Перспектыўныя ў гэтым накірунку — арганізацыя купальна-пляжнага адпачынку, водна-спартыўных і прамыслова-паляўнічых тураў, цеплаходных прагулак і экскурсій. Пра актуальнасць пытання сведчаць і сусветныя тэндэнцыі. Напрыклад, у краінах ЕС аб'ём продажу малых суднаў склаў звыш 25 мільярдаў еўра, а колькасць спажыўцоў ацэньваецца ў лічбу каля 48 мільёнаў чалавек. У Расіі штогадовы прырост прагулачных суднаў складае 3-4 тысячы адзінак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША	3 012,00	1 чэшская крона	153,83	USD	30,8958
▲1 еўра	3 810,18	1 польскі злоты	959,48	10 UAH	39,1582
1 латвійскі лат	5 407,06	▼1 расійскі рубель	97,49	1000 BYR	10,2508
1 літоўскі літ	1 109,15	1 украінская грыўня	381,75	EUR	39,0894

Агенцтва Уладзіміра Грыцова

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	IV квартал
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

«Кардынальных змяненняў у нарматыўна-прававой базе па рабоце са зваротамі грамадзян не патрабуецца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыём у Стаўбцоўскім райвыканкаме праводзіцца ў рамках трэцяга этапу маніторынгу работы органаў мясцовай улады з насельніцтвам. Ён паказаў, што такія выпадкі, калі вырашэнне праблем насельніцтва звязана з некалькімі ведамствамі, могуць вырашыцца за месяц, не вырашаюцца гадамі, а звароты людзей проста ігнаруюцца, чыноўнікі абыходзяцца адпіскамі. «Мы будзем з гэтым разбірацца і прымаць самыя строгія меры, як таго патрабуе Прэзідэнт», — сказала Наталля Пяткевіч, гаворачы аб звароце наконт рамонту вентыляцыі. «Такім людзям не месца ў дзяржаўных арганізацыях, яны павінны звальняцца», — лічыць Наталля Пяткевіч.

На яе думку, многія праблемы, якімі даводзіцца займацца на рэспубліканскім узроўні, можна вырашыць на месцах, калі кожны (не толькі прадстаўнікі дзяржапарату) будзе працаваць добрасумленна. «Калі гэтых з'яў будзе менш, наша жыццё стане значна лепшым. Калі б кожны на сваім месцы — дыспетчар у ЖЭСе або прадстаўнік райвыканкама — вырашалі пытанні як мага аператыўней, гэтых праблем не было б», — сказала Наталля Пяткевіч.

Трэці этап маніторынгу работы органаў мясцовай улады з насельніцтвам працягваецца. Міжведамасная рабочая група Адміністрацыі Прэзідэнта працуе ў Крупскім і Чэрвеньскім раёнах. Актывісты рэгіянальнага аддзялення грамадскага аб'яднання «Белая Русь» таксама падключыліся да гэтай работы, яны праводзяць пазачарговыя прыёмы ў Лагойску і Барысаве.

Не народ да ўлады, а ўлада — да народа

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усё гэта насамрэч вельмі важна для захавання пазіцый на наяўных рынках і выхаду на новыя. Тэхніка БелАЗа сёння працуе ў 70 краінах свету — ад Аўстраліі да ПАР. Толькі сёлета адгрузілі ўжо больш за тысячу машын у 36 краін свету.

БелАЗ — прадпрыемства горадаўтваральнае для Жодзіна. А значыць, сацыяльна-эканамічная, палітычная абстаноўка ў рэгіёне залежыць ад работы прадпрыемства. І нават паказчыкі тут не галоўнае. «Галоўнае, ці ёсць у прадпрыемства стратэгія развіцця, продажаў, новыя навуковыя распрацоўкі, — мяркуе У. Андрэйчанка. — І я магу сказаць, што будучыня ў прадпрыемства ёсць. Аказваецца сур'ёзная сацыяльная падтрымка працаўнікам. Заробак па заводзе больш чым 1,6 млн, таксама аказваецца добрая падтрымка пенсіянерам, а гэта амаль тры тысячы чалавек».

Падобная шматбаковая камунікацыя, як бачым, нясе пазітыўны эфект для кожнага звяна ў ланцугу. І такая работа, паводле слоў У. Андрэйчанкі, — гэта не разавы акт. Для парламентарыяў, у прыватнасці, яна пастаянная — яны рэгулярна кантактуюць з выбаршчыкамі ў акругах. Ды і ўвогуле такі настрой у краіне, што «гэта работа не скончыцца, пакуль не будзе наведзены парадак», — запэўнівае палітык.

Зоя ВАРАНЦОВА, *Жодзіна.*

ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ПРАБЕЛЫ ЖКГ

ТРЭЦІ этап маніторынгу работы органаў улады з грамадзянамі на Гомельшчыне пачаўся з Рэчыцы. Бадай палова з тых, хто прыехаў у горад над Дняпром, — з Гомеля: многія — у другі, а некаторыя — у трэці раз за гэтае лета. Але ж першымі на прыём да міністра юстыцыі Віктара ГАЛАВАНАВА, які ўзначальвае міжведамасную рабочую групу, прапусцілі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, што было зразумела ўсім.

Георгій ЗАКРЭЎСКІ папрасіў пракантраляваць працу абласнога шпіталя Вялікай Айчыннай, куды ён час ад часу трапляе на лячэнне. Не задавальняе яго стан бялізны, санітарна-гігіенічныя ўмовы і якасць лячэння. Бо, гаворыць ветэран, трапіў не ў тое аддзяленне, куды яму было патрэбна. Міністр юстыцыі прымае ўсе скаргі, а не толькі па сваім асноўным профілі, і таму паабяцаў, што пытанне будзе пастаўлена на кантроль і абавязкова праверана — ветэранаў крыўдзіць нельга.

З **ветэранам Вялікай Айчыннай Леанідам РОЗБЕРГАМ** камісія гутарыла больш за гадзіну, і па яго шматлікіх пытаннях адразу ж заклікалі да адказу многіх супрацоўнікаў мясцовых уладаў, якія давалі свае тлумачэнні. Пытанні быццам бы і невялікія, але для чалавека, які кальсьці ахвяраваў сваё здароўе Радзіме — вельмі важныя. Імі па даручэнні міністра будуць займацца ў самы бліжэйшы час мясцовыя ўлады.

Складаных пытанняў не вельмі шмат. У асноўным — знаёмыя да болю — жыллёва-камунальныя.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама Маргарыта ЖОРАВА вядзе прыём грамадзян паралельна з міністрам і часткова «знімае» пытанні, з якімі грамадзяне прыходзяць да членаў міжведамаснай рабочай групы.

Шмат пытанняў проста растлумачальных. Гэта гаворыць пра тое, што не ўсе ведаюць свае правы, якія, напрыклад, звязаны з падзелам маёмасці паміж сужэнцамі, набыццём маёмасці па дагаворах, атрыманнем у спадчыну. Часта — звязаныя з рэалізацыяй зямельнага права. Спрэчкі паміж карыстальнікамі зямельных участкаў, з дзяржавай за межы зямельных участкаў, за права ўласнасці. Але часцей за ўсё скаргі на аплату камунальных паслуг, уцяпленне сцен, капітальны рамонт будынкаў — практычна трэцяя частка. Сёння карыстальнік жыллёва-камунальных паслуг павінен разумець, што цяпер зусім іншы падыход да фінансавання. У дамах частка кватэр у камунальнай уласнасці, а частка — ва ўласнасці грамадзян. І таму ўзнікаюць зусім іншыя падыходы ў разглядзе спрэчак. Многія не могуць зразумець, чаму трэба плаціць за капітальны рамонт. Цяпер большы цяжар аплаты паслуг ускладаецца на плечы насельніцтва. І яшчэ — у нас няма празрыстасці ва ўзаемаадносінах жыллёва-камунальных службаў з грамадзянамі. Калі б часцей яны інфармавалі, як фарміруюцца тарыфы, як размяркоўваюцца сродкі, можа быць, народ так бы не абураўся.

— Ці многа пытанняў, якія павінны вырашацца на ўзроўні краіны, а не вобласці?

— Па першым этапе маніторынгу мы ўнеслі свае прапановы на ўдасканальванне заканадаўства па зямельным, жыллёвым праве. Былі пытанні, якія патрабавалі заканадаўчага ўмяшальніцтва. І сёння такія былі пытанні.

— Недарэмна праводзіцца маніторынг?

— Недарэмна. Маё асабістае меркаванне не толькі як члена Савета Рэспублікі, але і як юрыста ўвогуле — сёння вельмі шмат зроблена для насельніцтва дзяржаўнымі органамі. І ўсё накіравана на тое, каб чалавеку менш трэба было хадзіць па розных інстанцыях. Але любы зварот паказвае, што патрэбна навучыць людзей ведаць і свае правы, і свае абавязкі. Праблемы, якія ўзнікаюць, часта звязаныя з тым, што мы своечасова штосьці не зрабілі, ці таму, што мы штосьці зрабілі не так. Сёння трэба вучыць грамадзян краіны рабіць усё згодна з законам. Калі трэба нешта зарэгістраваць у тэрмін да сямі дзён — трэба гэта рабіць. Калі смерць рэгіструюць да 10 дзён — так і трэба рабіць. Калі праходзяць гады і ўзнікаюць пытанні, звязаныя са справамі вельмі даўнімі, пачынаюцца і праблемы: аднаўленне патрэбных папер, судовыя спрэчкі... Калі мы навучымся быць законапаслухмянымі, у нас не будзе праблем у будучыні.

Усе звароты, якія паступаюць у ходзе трэцяга этапу маніторынгу, бяруцца на кантроль і з рэзалюцыямі кіраўніка міжведамаснай рабочай групы накіроўваюцца ў адпаведныя мясцовыя органы для аб'ектыўнага і прафесійнага рашэння.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара. *Рэчыца.*

Махляр-валютчык абмяняў 100-доларавую купюру на 85 тысяч

Маладая мінчанка імкнулася абмяняць 100 долараў у адным са сталічных абменных пунктаў побач з Камароўскім рынкам у сталіцы. Да яе падышоў малады чалавек і прапанаваў абмяняць грошы па больш выгадным курсе. Дзяўчына пагадзілася.

Аддаўшы 100 долараў і пералічыўшы атрыманыя беларускія купюры, жанчына высветліла, што не хапае пяці тысяч. Яна вярнула гэтыя грошы маладому чалавеку, які ў яе на вачах пачаў іх пералічваць, пагадзіўся, што не хапае 5 тысяч і даклаў. Другі раз дзяўчына пералічваць стос купюр не стала і развіталася з мужчынам. Праўда, калі праз 20 хвілін яна дастала з сумачкі гэтыя грошы, высветлілася, што, малады чалавек перадаў ёй усяго 85 тысяч, а 215 «спрытнымі рухамі рук» непрыкметна забраў сабе. Дзяўчына хутка патэлефанавала ў міліцыю, і па названых ёй прыкметах нарад патрульна-паставой службы мужчыну затрымаў.

Як расказала «Звяздзе» прэс-афіцэр Савецкага РУУС сталіцы Вольга Яскевіч, у дачыненні да затрыманага, а ім аказаўся 27-гадовы кіроўца аднаго са сталічных прадпрыемстваў, заведзена крымінальная справа па ч.1 арт. 209 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь («Махлярства»).

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ Мінскі парк культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў адзначаны ў намінацыі «Лепшы парк забаў з колькасцю наведвальнікаў ад 500 тыс. да 1 млн чалавек у год» па выніках міжнароднага конкурсу-агляду «Крышталёвае кола-2010» сярод вытворцаў атракцыёнаў і паркаў краін СНД.

◢ **Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, канец жніўня і пачатак верасня ў Беларусі будуць дажджлівыя. Тэмпература паветра наблізіцца да кліматычнай нормы. У начныя гадзіны яна будзе вагацца ад плюс 8 да 15 градусаў, а ўдзень — ад 15 да 22 градусаў. У пачатку верасня дзённая тэмпература не перавысіць 15-20 градусаў.**

◢ Брэсцкія мытнікі затрымалі 3 тоны неаформленых спартыўных анаболікаў. Груз знайшлі пры даглядзе аўтацягніка, які накіроўваўся з Нямеччыны ў Казахстан. Было знойдзена 70 найменняў тавараў, не пазначаных у дакументах, а таксама бялковае харчаванне і спартыўны рыштунак з перавышэннем заяўленай вагі на 3 тоны. Кошт грузу, які перамяшчаўся цераз мытную мяжу з парушэннем заканадаўства, склаў каля 400 мільёнаў беларускіх рублёў. Яго лёс вырашыць суд Маскоўскага раёна горада Брэста.

◢ **У Швейцарыі працягваецца збор подпісаў за рэферэндум па ўзнаўленні смяротнай кары. Прыхільнікі гэтай ініцыятывы тлумачаць сваё рашэнне тым, што, на іх думку, правасуддзе занадта мяккае да злачынцаў. Вядома, што ініцыятарамі збору галасоў сталі людзі, чые родныя сталі ахвярамі жорсткіх забойстваў. Яны сцвярджаюць, што заканадаўства не дазваляе родным ахвяраў абараняць свае правы.**

Поўны абзац

◢ Паліцыя «павязала» нявесту проста на вяселлі. Не паспела 30-гадовая амерыканка выйсці замуж, як была арыштаваная супрацоўнікамі паліцыі за ваджэнне ў нецвярозым стане. Кіруючыся дадому на аўто са сваім нарачоным, жанчына была спыненая супрацоўнікамі дарожнай службы. Тэст на ўтрыманне алкаголю ў крыві паказаў перавышэнне нормы ўдвая. Паколькі за яе кар'еру кіроўцы гэта быў не першы выпадак, жанчына была затрыманая і дастаўленая ва ўчастак проста ў вянчальнай сукенцы. Супрацоўнікі паліцыі пачалі рыхтаваць дакументы для суда.

◢ **Немцы прадаюць піва... у аптэках. Гэты напой — лепшы за любыя лекі, лічаць нямецкія півавары. Аматарам сваёй прадукцыі яны прапаноўваюць новы «здаровы» гатунак піва Karla, які здольны супакоіць нервы і нават папярэдзіць пухліны. Дзе-нідзе яго пачалі выстаўляць на продаж у аптэках. «У некаторыя дні я прадаю больш піва, чым аспірыну», — сцвярджае аптэкар Андрэас Куглер. Але эксперты па праблемах алкагалізму скептычна ставяцца да гэтага. «Піва шкоднае для здароўя, і яму не месца ў аптэцы», — сцвярджае Ральф Халінгхорст, кіраўнік Нямецкага цэнтра па пытаннях алкагольнай і наркатычнай залежнасці. Тым не менш сёння тры чвэрці мужчын і 29 % жанчын у Нямеччыне рэгулярна спажываюць піва.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БЕЛАРУСЬ ПЛАНУЕ ДЫВЕРСІФІКАВАЦЬ ПАСТАЎШЧЫКОЎ ПРЫРОДНАГА ГАЗУ

Беларусь плануе ажыццявіць дыверсіфікацыю рэгіёнаў і пастаўшчыкоў прыроднага газу. Аб гэтым гаворыцца ў стратэгіі развіцця энергетычнага патэнцыялу Беларусі, якая зацверджана пастановай Савета Міністраў № 1180 і разлічана на перыяд да канца 2020 года. Тэкст дакумента апублікаваны на Нацыянальным прававым партале, паведамляе карэспандэнт **БЕЛТА**.

Пры выбары варыянтаў задавальнення патрэбнасці рэспублікі ў прыродным газе будуць улічвацца такія фактары, як забяспечанасць запасамі патэнцыяльных пастаўшчыкоў, наяўнасць неабходнасці стварэння транспартнай інфраструктуры яго дастаўкі, эканамічнасць і цэны на газ.

Цяпер у сярэднеазіяцкім рэгіёне экспарцёрамі прыроднага газу з'яўляюцца Туркменістан, Узбекістан і Казахстан. Сярэднеазіяцкі газ пастаўляецца (у асноўным у Расію і Украіну) па сістэме магістральных газаправодаў Сярэдняя Азія — Цэнтр. У сярэднетэрміновай перспектыве з улікам наяўнасці доўгатэрміновых кантрактаў ААТ «Газпрам» на закупку практычна ўсіх экспартных аб'ёмаў сярэднеазіяцкага газу, а таксама адсутнасці незалежнай транспартнай інфраструктуры не ўяўляецца магчымай яго прамая пастаўка ў Беларусь. Дыверсіфікацыя паставак газу будзе прадоўжана на праз удзел беларускіх арганізацый у разведцы і здабычы газу за мяжой, пастаўкі звадкаванага прыроднага газу (рэалізацыя праектаў будаўніцтва на тэрыторыі Літвы або Польшчы тэрміналаў па прыёме і рэгазіфікацыі звадкаванага прыроднага газу), у тым ліку праз Украіну. У выпадку рэалізацыі праекта пастаўкі звадкаванага прыроднага газу яго аб'ём можа скласці да 10 млрд куб.м у год, што значна знізіць залежнасць ад паставак прыроднага газу з Расіі.

Альтэрнатыўнымі існуючым і перспектыўнымі для Беларусі ў сферы паставак энерганосьбітаў у дакументе названы Каспійскі, Сярэднеазіяцкі, Паўднёва-Амерыканскі рэгіёны, а таксама рэгіён Персідскага заліва. З улікам праведзеных экспертных ацэнак розных варыянтаў дыверсіфікацыі паставак энерганосьбітаў для арганізацыі бяспекі энергазабеспячэння краіны ў сярэднетэрміновай перспектыве мяркуецца пашырыць разведку і здабычу ўласных першасных энергарэсурсаў, працаваць магчымасці далучэння Беларусі да праектаў Еўрапейскага саюза па дыверсіфікацыі паставак энерганосьбітаў, дыверсіфікаваць рэгіёны і пастаўшчыкоў прыроднага газу, нафты, прадуктаў яе перапрацоўкі і электрычнай энергіі, актывізаваць работу па здабычы паліўна-энергетычных рэсурсаў у іншых краінах.

ЗРУШЫЎ ПЛІТУ НА КАЛЕГУ

На будаўніцтве каля вёскі Маскалёўка ў Нараўлянскім раёне трактарыст мясцовага будаўнічага прадпрыемства перагружаў жалезабетонныя пліты. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, 50-гадовы мужчына не заўважыў, як зрушыў пліту памерам 1,2х1,8 м на аднагодку і калегу, які ў гэты момант ляжаў на зямлі. Чалавек загінуў. Падрабязнасці трагедыі высвятляе пракуратура.

ПРАЗ ДЗІРКУ Ў ДАХУ,

якую сам і зрабіў, трапіў у памяшканне, дзе захоўваўся гербіцыд «Таргет супер» вартаўнік філіяла ААТ «Гомельлён» Кармянскага льнозавода. На працягу месяца 35-гадовы мужчына выцягнуў 33 каністры, кошт якіх складае больш за 8,5 млн рублёў. Каштоўнае рэчыва для апрацоўкі раслін захоўвалася ў адселенай вёсцы Гарадок Кармянскага раёна. Частку выкрадзенага ўдалося канфіскаваць пасля затрымання злодзея, які спакусіўся на тое, што павінен быў ахоўваць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«АДНО АКНО» ЗАМЕСТ НЕКАЛЬКІХ ДЗВЯРЭЙ?

У студзені 2011 года пачнецца ўкараненне чарговага этапу маштабнага праграмнага комплексу (далей — ПК) «Адно акно». Такое спадзяванне выказала намеснік начальніка ўпраўлення адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асобаў Міністэрства юстыцыі Беларусі Ірына ПЯТРОВА.

Паводле слоў Ірыны Віктараўны, ужо сёння магчымасцямі праграмнага комплексу актыўна карыстаюцца ў 72 раёнах краіны. Інфармацыйная аўтаматызаваная сістэма дазваляе ў аўтаматычным рэжыме, без хаджэння самім грамадзян па розных інстанцыях, ажыццяўляць больш за 180 адміністрацыйных працэдур. І гэта не мяжа. У бліжэйшыя два гады плануецца ахапіць праграмным комплексам як усе рэгіёны, так і ўвесь пералік адміністрацыйных працэдур (зацверджаны Указам Прэзідэнта № 200 ад 26 красавіка 2010 года), якія ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі па зваротах грамадзян.

— Распрацоўка ПК «Адно акно» дазволіла стварыць неабходныя ўмовы для пераходу на новую форму дакументаабароту, — адзначыла Ірына Пятрова. — Праграмны комплекс уяўляе сабой web-партал, які складаецца з дзвюх частак: адкрытай і закрытай. Першая з'яўляецца свайго роду даведачнай службай для грамадзяніна. Кожны, хто хоча, можа зайсці на партал і азнаёміцца з пералікам заканадаўчых актаў, прынятых у мэтах рэалізацыі прынцыпу «аднаго акна», актуальнымі навінамі, атрымаць інфармацыю аб працэдурах і неабходных для прадстаўлення ў дзяржаўныя органы дакументах, аб тэрмінах выканання працэдур.

Закрытая частка партала — працоўнае месца спецыяліста дзяржаўнага органа. Яна дазваляе дзяржаўнаму службоўцу аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю ад іншых дзяржаўных органаў. Так, напрыклад, пры пастаноўцы сям'і, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, на ўлік не трэба адпраўляць пісьмовы запыт у загс і чакаць, пакуль прыйдзе пацвярджэнне, што шлюб у гэтых людзей першы. Усё гэта робіцца ў лічаныя хвіліны пры дапамозе інтэрнэту.

— База звестак ПК «Адно акно» надзейна абароненая ад несанкцыянаванага доступу, — пераканана Ірына Пятрова. — Кожны супрацоўнік дзяржаўнага органа мае доступ толькі да той інфармацыі, якая яму неабходная для работы.

На перспектыву разглядаецца магчымасць падключацца да ПК «Адно акно» праз партал у інтэрнэце не толькі дзяржаўным органам, але і звычайным грамадзянам. Плануецца, што ў кожнага беларуса будзе магчымасць замовіць тую ці іншую адміністрацыйную працэдуру ў онлайн-рэжыме.

— Для гэтага ўсім ахвотным будуць выдавацца спецыяльныя «USB-ключы» персанальнага электронна-лічбавага аўтографа — такія зараз выдаюцца фізічным асобам, якія хочуць падаваць падатковыя дэкларацыі ў электронным выглядзе, — тлумачыць Ірына Віктараўна. — Пры гэтым з дапамогаю аднаго і таго ж ключа можна будзе падаваць не толькі падатковую дэкларацыю, але і заяву для выканання адміністрацыйнай працэдуры. Аналагічны парадак мы зараз прадугледжваем і для ажыццяўлення чалавекам падачы дакументаў для электроннай дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання — юрыдычных асобаў, індывідуальных прадпрымальнікаў.

Ірына Пятрова таксама лічыць, што нядрэнна было б стварыць у нашай краіне і дзяржаўны орган, які б ажыццяўляў метадалогію па выкананні адміністрацыйных працэдур. У гэтым выпадку заяўніку дастаткова было б адправіць электронную заяву на адрас гэтага органа, які б, у сваю чаргу, вызначаў, хто непасрэдна на тэрыторыі краіны павінен выконваць канкрэтную адміністрацыйную працэдуру.

Электронна-лічбавы подпіс для запаўнення электронных заяў будзе ўведзены, плануецца, у наступным годзе.

— Я не магу зараз сказаць, будзе гэта першы ці чацвёрты квартал 2011 года, — кажа Ірына Пятрова. — Усё будзе залежаць ад многіх фактараў, і ў першую чаргу ад таго, ці зацвердзіць нашу заяву на ўкараненне чарговага этапу ПК «Адно акно» ў межах новай дзяржаўнай праграмы інфарматызацыі «Інфармацыйнае грамадства» Міністэрства сувязі і інфарматызацыі.

Міністэрства юстыцыі, у сваю чаргу, гатова працягваць работу над удасканаленнем ПК «Адно акно», пашыраць функцыянальныя магчымасці адкрытай і закрытай частак партала, пашыраць аўтаматычнае міжведамаснае ўзаемадзеянне...

— Зразумела, калі праграмны комплекс будзе рэалізаваны ў поўным аб'ёме, думаю, што і тэрміны выканання адміністрацыйных працэдур для грамадзян будуць значна скарочаны, — выказала думку суразмоўца. — Вопыт жа ўкаранення інфармацыйнай сістэмы паказаў, што найбольшую выгоду атрымалі сельскія жыхары. Ім цяпер не трэба хадзіць па калідорах райвыканкама, страчваючы час і, адпаведна, грошы на транспарт.

Надзея ДРЫЛА.

«ВЫНІКІ ЦТ — ГЭТА РЭАЛЬНАЯ АЦЭНКА ЎЗРОЎНЮ ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У будучыні ўсе абітурыенты павінны быць у роўных умовах, а ў сценах ССНУ трэба пакінуць толькі экзамены па творчасці...», — падзяліўся сваім бачаннем гэтай сітуацыі Анатоль Рубінаў.

Таксама ў наступным годзе эксперымент, які праводзіўся два гады ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, можа распаўсюдзіцца і на творчыя спецыяльнасці іншых ВНУ, напрыклад, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Як вядома, на цэнтралізаваным тэсціраванні абітурыенты творчых спецыяльнасцяў здаюць дзве дысцыпліны: адну з дзяржаўных моў і гісторыю Беларусі. Плюс творчыя іспыты непасрэдна ў навучальнай установе. «Вага» дзвюх дысцыплін цэнтралізаванага тэсціравання ў агульнай суме балаў, зароблены на ўступных іспытах, раней была вельмі істотная, і нярэдка нават выдатныя музычныя, артыстычныя ці мастацкія здольнасці не маглі стаць для адораных маладых людзей пропускам у кола студэнтаў. Таму ў парадку эксперыменту было вырашана павялічыць «вагу» творчых дысцыплін. Залічэнне ў гэтыя дзве ВНУ ажыццяўлялася на падставе агульнай сумы балаў, падлічанай па выніках правядзення трох этапаў уступных іспытаў па прадмеце «творчасць», сярэдняга бала сумы балаў, атрыманай па выніках ЦТ, і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

На што спадзяюцца маладыя людзі, якія пакідаюць аўдыторыю на працягу першых 30 хвілін з пачатку цэнтралізаванага тэсціравання? Яны або здаюць пустыя бланкі адказаў, або спрабуюць угадаць правільны адказ, або ўвогуле пакідаюць у бланках нецэнзурныя словы...

— Калі б абітурыенты паступалі па ранейшай сістэме, то многія з іх, зразумела, прайсці б не змаглі, а так мы далі шанц самым таленавітым, — упэўнены Анатоль Рубінаў. — Мы пераканаліся, што веданне мовы і гісторыі, зразумела, вельмі важнае, але не больш важнае, чым талент для будучага мастака, танцора ці артыста...

Анатоль Рубінаў канстатаваў, што членаў дзяржаўнай камісіі не можа не хваляваць, як пэўная частка моладзі ставіцца да паступлення ў ВНУ і выбару спецыяльнасці. На што, цікава, спадзяюцца маладыя людзі, якія пакідаюць аўдыторыю на працягу першых 30 хвілін з пачатку цэнтралізаванага тэсціравання? Яны або здаюць пустыя бланкі адказаў, або спрабуюць угадаць правільны адказ, або ўвогуле пакідаюць у бланках нецэнзурныя словы... А колькасць такіх выпадковых людзей даходзіць на некаторых прадметах да 20 працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто прыйшоў на тэсціраванне... Між іншым, іх вынік таксама ўплывае на сярэдні бал удзельнікаў тэсціравання.

— Не буду хаваць, што мы назіралі сёлета зніжэнне сярэдняга бала на ЦТ па многіх прадметах (прыкладна на 2,5 адзінкі), за выключэннем геаграфіі, гісторыі Беларусі і грамадазнаўства, — прызнаўся старшыня дзяржаўнай камісіі. — Колькасць абітурыентаў, якія набралі нізкія балы, на жаль, павялічваецца. Так, на тэсціраванні па матэматыцы 20 балаў і менш набралі 62 працэнты яго ўдзельнікаў (у 2009 годзе — 58 працэнтаў і ў 2008 годзе — 57 працэнтаў). Па фізіцы не змаглі пераадолець бар'ер у 20 балаў 73 працэнты з тых, хто здаваў гэты прадмет (летась — 70 працэнтаў, а ў 2008 годзе — 66 працэнтаў). Натуральна, нас цікавілі прычыны такога становішча. Можа быць, тэсты былі складаныя ці формула падліку балаў у нас недасканалая? На думку незалежных экспертаў, тых жа рэпетытараў, якія з'яўляюцца незацікаўленымі асобамі, тэсты не былі звышскладанымі, і змест заданняў не выходзіў за рамкі школьнай праграмы. Затым мы прааналізавалі сістэму падліку балаў пры правядзенні тэсціравання ў іншых краінах і пераканаліся, што наша сістэма — не горшая. Значыць, прычыны зніжэння балаў на ЦТ трэба шукаць у падрыхтоўцы прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. У гэтым годзе ў ЦТ удзельнічалі 170 тысяч абітурыентаў, а са школ выйшла 88 тысяч выпускнікоў. Выходзіць, што больш за палову абітурыентаў закончылі школы ў папярэднія гады. Можа меркаваць, што не ўсе з іх добра падрыхтаваліся. Многія былі першапачаткова нацэленыя на платную завочную форму навучання. Таму вынікі цэнтралізаванага тэсціравання — гэта рэальная ацэнка ўзроўню падрыхтоўкі сёлетніх абітурыентаў. Аднак, хачу падкрэсліць, што калі вы пагледзіце на вынікі залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання, то там вы не ўбачыце абітурыентаў з нізкімі баламі. Зусім іншая сітуацыя — на завочнай і платнай формах навучання...

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

На дзённую бюджэтную форму навучання ў ВНУ па-за конкурсам было залічана 598 чалавек, з іх дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі — 522.

Без уступных іспытаў залічана 305 чалавек.

Па агульным конкурсе залічаны: 2126 школьных медалістаў, 5247 выпускнікоў сельскіх школ, 167 дзяцей-інвалідаў і інвалідаў 1 і 2 груп, 188 замежных грамадзян, у тым ліку 136 грамадзян Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана.

Пазітыўнай тэндэнцыяй можна лічыць той факт, што выпускнікі сельскіх школ па выніках цэнтралізаванага тэсціравання зусім нязначна адстаюць ад гараджан, і гэта пры адсутнасці ў сельскай мясцовасці інстытута рэпетытарства: розніца ў сярэдніх балах гараджан і вяскоўцаў складае ў залежнасці ад прадмета ад 0,3 да 5 балаў (летась яна была ад 0,9 ад 6 балаў). Гэта, на думку Анатоля Рубінава, сведчыць у першую чаргу пра павышэнне якасці падрыхтоўкі ў сельскіх школах і выраўноўванне стартавых магчымасцяў абітурыентаў з гарадоў і сельскай мясцовасці. А, напрыклад, у Белдзяржуніверсітэце на 28 спецыяльнасцях з 55 у выхаванцаў сельскіх школ былі нават больш высокія балы, чым у гараджан, таму залічэнне адбывалася там па агульным конкурсе. Закрануўшы тэму асобнага конкурсу для сельскіх абітурыентаў, Анатоль Рубінаў спыніўся на адным упушчэнні: для гэтай катэгорыі абітурыентаў ніжняя мяжа не ўстаноўлена. Таму, напрыклад, на рамана-германскую філалогію ў БДУ змог паступіць абітурыент з сельскай мясцовасці, які меў у сваім багажы 207 балаў. Ён проста быў адзіны, хто ішоў па асобным конкурсе. А абітурыенты-гараджане, якія мелі на 90 балаў больш, прайсці на бюджэт не змаглі. Напэўна, гэта не зусім правільна.

Яшчэ адна балючая тэма — існаванне льгот для пэўных катэгорый абітурыентаў. Скажам, па-за конкурсам могуць паступаць дзеці-сіроты. У Белдзяржуніверсітэце на спецыяльнасць «паліталогія» змаглі паступіць у гэтым годзе льготнікі, якія мелі ўсяго 118 балаў (па трох прадметах ЦТ плюс сярэдні бал атэстата), хоць для іншых абітурыентаў прахадны бал быў 348. Прычым льготнікі занялі 40 працэнтаў бюджэтных месцаў. А на спецыяльнасці «бізнэс-адміністраванне» змог паступіць абітурыент, які меў 109 балаў у агульнай суме, затое абітурыенты, якія набралі больш за 300 балаў, зноў-такі не прайшлі (прахадны бал быў 336). У цяперашніх правілах прыёму ёсць адна агаворка: льготны прыём можа ажыццяўляцца толькі на тых спецыяльнасцях, дзе ў папярэдні год конкурс быў 5 і больш чалавек на месца. Але гэта палажэнне відавочна састарэла, бо сёння на тых спецыяльнасцях, дзе залічэнне адбываецца толькі па выніках ЦТ, трэба кіравацца не сярэднім конкурсам, а прахадным балам.

— Мяркую, што ёсць пэўная катэгорыя маладых людзей, якім патрабуецца дзяржаўная падтрымка, але аказваць такую падтрымку больш правільна было б падчас іх навучання: гэта можа быць гарантаванае месца ў інтэрнаце, стыпендыяльная падтрымка, матэрыяльная дапамога, але на ўваходзе ў ВНУ нікому нельга рабіць ніякіх скідак. На першым плане павінны быць усё ж такі веды, — дадаў Анатоль Рубінаў.

У галоўным адукацыйным ведамстве краіны не хаваюць, што вялікая колькасць льготных катэгорый абітурыентаў ускладняе і распрацоўку аўтаматызаванай сістэмы залічэння. Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў паведаміў, што такая сістэма распрацоўваецца спецыялістамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі і Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў з улікам сусветнай практыкі.

— У Азербайджане, дзе ўжо даўно дзейнічае аўтаматызаваная сістэма, не існуе на ўваходзе ў ВНУ ніякіх льготаў. І нават невідушчыя людзі здаюць там тэсты, выкананыя шрыфтам Брайля, — дадаў Аляксандр Радзькоў, — у той час як у нашай краіне для абітурыентаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ствараюцца спецыяльныя ўмовы для здачы экзамена непасрэдна ў ВНУ. Ім не трэба ўдзельнічаць разам з усімі ў цэнтралізаваных іспытах.

Аляксандр Радзькоў патлумачыў, што аўтаматызаваная сістэма залічэння абапіраецца на сістэму прыярытэтаў абітурыента. Абітурыент сам указвае ў спецыяльнай форме тыя навучальныя ўстановы ці тыя спецыяльнасці, куды б ён хацеў паступіць: першы прыярытэт, другі, трэці і гэтак далей. А аўтаматызаваная сістэма ўлічвае яго пажаданні, набраную колькасць балаў, параўноўвае яго балы з баламі канкурэнтаў і прапануе яму тую ВНУ і тую спецыяльнасць, куды ён можа быць залічаным, зыходзячы з набраных балаў. Трэба будзе вызначыцца толькі з колькасцю прыярытэтаў. Мяркуецца, што эксперыментальная апрабацыя аўтаматызаванай сістэмы залічэння адбудзецца ў 2012 годзе, і калі эксперымент пройдзе ўдала, то ўжо ў наступным годзе абітурыентам не прыйдзецца бегаць паміж прыёмнымі камісіямі, не трэба будзе сачыць за развіццём конкурсу ў інтэрнэце, а застанецца толькі дачакацца прыемных навінаў. У Міністэрстве адукацыі не лічаць гэта фантастыкай. Аляксандр Радзькоў упэўнены, што лепш ажыццяўляць набор не на спецыяльнасці, а на факультэт. «Мне падаецца, што першыя два гады студэнты павінны вывучаць агульныя курсы, і толькі пазней выбіраць сабе больш вузкую спецыялізацыю», — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі міністр.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в частную собственность в г. Бресте

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. Шафрановая, 30 № 140100000001025519	ул. Шафрановая, 31 № 140100000001025518	ул. Шафрановая, 42 № 140100000001025520	ул. Берестовая, 46 № 140100000001025521	ул. Кедровая, 58 № 140100000001025522
№ лота	1	2	3	4	5
Начальная цена продажи (руб.)	9 074 100	9 041 130

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 жніўня 2010 г. № 29 (223)

Мінус беспрацоўе. І... падаткі

Адлегласць ад пасёлка Смілавічы да Мінска складае крыху больш за тры дзясяткі кіламетраў, прычым сама па сабе падобная акалічнасць шмат у чым вызначае спецыфіку гэтага рэгіёна.

З аднаго боку тут існуе магчымасць амаль без перашкод карыстацца разгалінаванай сталічнай інфраструктурай, практычна адсутнічае праблема беспрацоўя, а да таго ж — назіраецца паступовае «міграцыйнае» павелічэнне насельніцтва. Аднак суседства з буйным горадам вядзе і да пэўных праблем. І ў прыватнасці, час ад часу ўзнікаюць «дадатковыя» пытанні са смеццем, злачыннасцю і... папаўненнем мясцовага бюджэту.

«Чужая тэрыторыя»?

Цікавая статыстыка. З 2200 дамоў у навакольлі Смілавічаў роўна палова — так званыя «дачныя». Зрэшты, асабліва непаразуменняў тут амаль не ўзнікае. Аднак ці не ў любым правіле заўсёды ёсць выключэнні.

— Многія дачнікі жывуць на нашай тэрыторыі з сакавіка па кастрычнік, і, тым не менш, некаторыя з іх упарта адмаўляюцца заключаць дамовы на вываз смецця. Што ж да размоў, нібыта «мы возім смецце ў Мінск», то яны падаюцца недарэчнымі, — заўважае кіраўнік спраў Смілавіцкага сельвыканкама Валянціна Дзямко. — Аднак дачнікі — праблема ўсё ж не галоўная. Нашмат горш, што на нашых палях час ад часу незразумелым чынам з'яўляюцца адыходы сталічных прадпрыемстваў. Нягледзячы нават на тое, што высветліць канкрэтнае паходжанне гэтага смецця не так і складана — «падказкі» даюць тыя ж надпісы на ўпакоўках.

Аднак стаўленне да навакольля як да «чужой тэрыторыі» праяўляецца не толькі ў гэтым. Непасрэдна ў Смілавічах працуе сельскагаспадарчы каледж. І ў тым ліку тут навучаецца моладзь з іншых рэгіёнаў.

— На наш погляд, навучэнцам з іншых рэгіёнаў неабходна часова надаваць статус смілаўчан, — лічыць старшыня пасялковага Савета Ірына Марціновіч. — У такім разе да іншагародніх можна будзе прад'яўляць большыя патрабаванні і, апроч таго, прыцягваць іх да добраўпарадкавання. Напэўна, тады б стаўленне некаторых з іх да пасёлка змянілася. Чалавек, які пасадзіў тыя ж кветкі, наўрад ці потым стане псаваць клумбу.

Адна праблема з тымі з навучэнцамі ўжо вырашылася. Забарона на распіццё піва ў грамадскіх месцах усё ж падзейнічала — колькасць моладзі, якая бавіць такім чынам вольны час на лаўках, прыкметна зменшылася. Затое стала больш парадку.

— Напэўна, цяпер трэба ісці далей, — разважае Ірына Марціновіч. — Не сакрэт, што апошнім часам па ініцыятыве Міністэрства аховы здароўя пачала актыўна абмяркоўвацца тэма забароны на продаж спіртных напояў асобам ва ўзросце да 21 года. Асабіста я адназначна падтрымліваю гэту прапанову. Бо часам п'янка — шлях да злачынства. І асабліва, калі гаворка ідзе пра моладзь.

Прыклад мацнейшы за правіла

Практычна знікла тут і яшчэ адна праблема. На пачатку дзесяцігоддзя адзначалася даволі распаўсюджаная з'ява: знаходзіліся прадпрымальныя людзі, якія ўгаворвалі мінчан з асацыяльным ладам жыцця прадаваць свае сталічныя кватэры і куплялі ім нашмат танейшае жыллё ў бліжэйшых раёнах.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

ЧЫЕ «СОТКІ»?

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сяражскі сельсавет — самы буйны ў Слуцкім раёне. Жывуць тут амаль 4 тысячы чалавек, а будзе больш — каля сотні дамоў яшчэ будуецца. Сельсавет прыгарадны, вызначыць мяжу, дзе заканчваецца яго апошні населены пункт Лучнікі і пачынаецца непасрэдна Слуцк, чалавеку прыезджаму ўвогуле немагчыма.

Аднак гэта блізкасць не вызваляе мясцовую ўладу ад вырашэння зямельных пытанняў. Апошнія ўсё часцей выходзяць на першы план, асабліва ў выпадках, калі людзі прымаюць у спадчыну зямельныя ўчасткі.

— І калі зямельны надзел пры доме складае больш за 25 сотак, а чалавек, які павінен прыняць яго ў спадчыну, не пражывае на тэрыторыі сельсавета, узнікаюць праблемы, — кажа сакратар Сяражскага сельвыканкама Людміла Крываль. — У адпаведнасці з існуючым заканадаўствам, «іншагародні» грамадзянін мае права прыняць у спадчыну і аформіць адным зямельным актам не больш за 25 сотак. А ўсе метры, якія застаюцца звыш гэтага, неабходна афармляць асобна, як яшчэ адзін участак — нягледзячы на тое, што надзел пры доме цэласны і размешчаны адным «кавалкам».

Напрыклад, тлумачыць Людміла Аляксееўну, пэўны ўчастак займае 40 сотак. Спадчыннiку давядзецца афармляць яго як два ўчасткі — 25 і 15 сотак адпаведна. Безумоўна, і плаціць за рэгістрацыю ў агенцтве таксама неабходна за кожны з іх паасобку.

— І добра яшчэ, калі пры доме ёсць 40 сотак. А калі 30? Тады з іх атрымліваецца 25 і 5 сотак. Афармленне неабходных папер на гэтыя 5 сотак будзе каштаваць чалавеку столькі ж, колькі і рэгістрацыя 25 сотак, — тлумачыць Людміла Крываль. — Для людзей гэта нявыгадна, дорага, таму яны ідуць па шляху найменшага супраціўлення — афармляюць на сябе толькі 25 сотак, а ад астатняй зямлі адмаўляюцца.

Здавалася б, сельскі Савет пры такой раскладцы павінен толькі радавацца — маўляў, участкі самі ідуць у рукі. Але... што мясцовай уладзе рабіць з імі далей? Перадаваць «чаргавікам» пад будаўніцтва жылля? Прадаваць? Тэарэтычна ўсё гэта магчыма, а фактычна... Як да таго ўчастка дабрацца, як ім карыстацца, як яго абслугоўваць-абкошваць, калі знаходзіцца ён, лічы, у чужым агародзе, заціснуты з усіх бакоў участкамі іншых гаспадароў?

— Вось і з'яўляюцца «кінутыя» кавалкі зямлі, выкарыстаць якія мы не можам, — кажа Людміла Крываль.

На яе думку, мэтазгодна было б афармляць увесь прысядзібны ўчастак (які перадаецца ў спадчыну пасля смерці ранейшага ўладальніка) адным зямельным актам, адзінымі дакументамі, незалежна ад колькасці сотак.

— Як афармляецца, напрыклад, тэхпашпарт на дом? Мы ж заўсёды робім толькі адзін тэхнічны пашпарт, незалежна ад таго, якую плошчу займае будынак — 50 квадратных метраў ці 250. А вось соткі пры доме чамусьці трэба дзяліць на два ўчасткі. Магчыма, такі падыход апраўдвае сябе там, дзе зямля вельмі дарагая і карыстаецца павышаным попытам, як, скажам, пад Мінскам. А ў нас у сельсавеце простыя людзі пытаюцца: «Адкуль два ўчасткі? Тут жа толькі адзін!». Асабліва калі гэтыя 30—40 сотак былі замацаваныя за домам спакон вякоў, гадоў з 50-х.

У працэсе работы Сяражскага сельвыканкама ўзнікаюць і іншыя пытанні, якія маюць непасрэднае дачыненне да навядзення парадку на зямлі. Немагчымасць іх вырашыць ушчамляе, з аднаго боку, інтарэсы грамадзян, з іншага — інтарэсы мясцовай улады.

— Праблема, зноў жа, датычыцца спадчыннікаў, якія не пражываюць на тэрыторыі нашага сельсавета, — тлумачыць Людміла Аляксееўна. — Часта ў іх няма ніякай цікавасці да спадчыны, што раптоўна на іх «звалілася». І людзей можна зразумець, асабліва калі ў спадчыну застаўся напаўабгарэлы ці разбураны дом. Якое ў такой сітуацыі напрошваецца лагічнае выйсце? Правільна, адмовіцца ад такога «падарунка лёсу» (інакш яго давядзецца прыводзіць у парадак і ўтрымліваць) на карысць органаў мясцовай улады. І чалавек ахвотна зрабіў бы гэта, але... Спачатку яму неабходна афармiць на сябе і рэшткі дома, і зямельны ўчастак у агенцтве па рэгістрацыі нерухомасці. І толькі потым можна атрымаць дазвол на знос. Інакш кажучы, **чалавек не можа проста адмовіцца ад маёмасці і аддаць дзяржаве свой участак — яму неабходна ўкласці пэўныя сродкі.** А хіба цікава ўкладаць сродкі ў тое, ад чаго ты збіраешся адмаўляцца? Вось людзі і не хочуць займацца гэтымі дамамі. І будынкі стаяць, дакладней, канчаткова развальваюцца, а ўчасткі зарастаюць, не прыносячы ніякай карысці... Мы, безумоўна, адпраўляем гаспадарам прадпісанні, папярэджваем. Але каму ад гэтага горача ці холадна? Спадкаемцы, якія жывуць у іншых населеных пунктах і зачастую ўжо самі выйшлі на пенсію, не хочуць і не могуць прыязджаць і даглядаць участкі, а тым больш займацца іх рэгістрацыяй і пераафармленнем.

Так, сельвыканкам можа падаць іскавую заяву ў суд, каб дом быў прызнаны безгаспадарным. Але адпаведная працэдура запатрабуе ад мясцовай улады пэўных грашовых укладанняў, і немаленькіх. А ўкладаць няма чаго, бо ў расходнай частцы сельсавецкага бюджэту такі артыкул не прадугледжаны.

— Нам значна прасцей было б працаваць, калі б працэдура адмаўлення ад спадчыны спрасцілася — каб людзям не абавязкова было афармляць на сябе непатрэбную маёмасць ды яшчэ і грошы за гэта плаціць. Яны тады хутчэй здзяйснялі б знос, а мы маглі б даваць свабодныя ўчасткі чаргавікам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — лічыць Людміла Крываль.

Наталля КАРПЕНКА,
Слуцкі раён.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

Мясцовая ўлада прапануе...

У межах работы Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Генадзя НАВІЦКАГА са старшынямі пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, якія павышаюць сваю кваліфікацыю ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У прыватнасці, кіраўнікі органаў мясцовай улады падкрэслівалі, што ў сельскіх населеных пунктах існуе праблема з рэгістрацыяй грамадзянамі домаўладанняў, атрыманых у спадчыну. Для пошуку спадчыннікаў сельсаветы затрачваюць немалыя фінансавыя рэсурсы і шмат часу, а існуючы механізм канчатковага вырашэння гэтых пытанняў праз суд неапраўдана зацягвае ўпарадкаванне тэрыторыі. Старшыні пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў прапанаўвалі заканадаўча замацаваць працэдуру **аўтаматычнага пераходу** такой нерухомасці ў распараджэнне дзяржавы праз строга рэгламентаваны час.

Таксама было ўзнятае пытанне аб больш эфектыўнай арганізацыі працы ўчастковых інспектараў міліцыі ў сельскіх населеных пунктах. Кіраўнікі першічнага звяна ўлады занепакоеныя даволі **частай іх змяняльнасцю**, а таксама адцягненнем іх ад непасрэдных службовых абавязкаў на даверанай ім тэрыторыі. Гэта не дазваляе ўчастковым інспектарам міліцыі ў поўнай меры ўзаемадзейнічаць з грамадскасцю, праводзіць індывідуальную прафілактычную работу, разглядаць пісьмы і заявы грамадзян.

Па выніках сустрэчы Генадзь Навіцкі накіраваў ліст з вышэйзгаданай інфармацыяй адпаведна ў Дзяржаўны камітэт па маёмасці і Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Днямі на імя старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі паступілі рэагаванні з указаных інстанцый.

«...Для своечасовай рэгістрацыі грамадзянамі правоў на зямельныя ўчасткі, якія перайшлі ім у спадчыну, артыкуламі 52 і 53 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі ўстаноўлены 18-месячны тэрмін з часу адкрыцця спадчыны для звароту у адпаведную арганізацыю па дзяржаўнай рэгістрацыі.

У супрацьлеглым выпадку права прыватнай уласнасці на зямельныя ўчасткі спыняецца пастановай суда, а права пажыццёвага спадчыннага ўладання зямельным участкам — рашэннем адпаведнага выканаўчага камітэта.

У мэтах падтрымання ў належным стане жылых дамоў у сельскіх населеных пунктах і скарачэння колькасці пустуючых і старых дамоў прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 70 «Аб мерах па ўпарадкаванні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі ў сельскай мясцовасці».

Гэтым Указам устаноўленыя ўмовы і парадак прызнання пустуючага дома безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, а таксама ўмовы і парадак адабрання старых дамоў у іх уласнікаў і спынення права ўласнасці, права пажыццёвага спадчыннага ўладання на зямельныя ўчасткі, на якіх размешчаны безгаспадарныя і старыя дамы.

*Мяркуем, што ўсталяванне працэдуры, пры якой указаная нерухомая маёмасць пасля заканчэння рэгламентаванага часу пераходзіла б у распараджэнне дзяржавы **без рашэння гэтага пытання ў судовым парадку**, супярэчыць артыкулу 44 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з ім недатыкальнасць уласнасці, права яе спадчыннасці ахоўваюцца законам, уласнасць, набытая законным спосабам, ахоўваецца дзяржавай, а прымусовае адчужэнне маёмасці дапускаецца толькі па матывах грамадскай неабходнасці пры захаванні ўмоў і парадку, вызначаных законам, са своечасовым і поўным кампенсаваннем кошту адчужанай маёмасці, а таксама згодна з пастановай суда.*

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Г.І. КУЗНЯЦОЎ».

* * *

«...Міністэрствам унутраных спраў прымаюцца меры па арганізацыі эфектыўнай працы ўчастковых інспектараў міліцыі. 30 сакавіка 2010 года на калегіі Міністэрства ўнутраных спраў было разгледжана пытанне «Аб мерах, якія прымаюць органы ўнутраных спраў па ўдасканаленні службовай дзейнасці ўчастковых інспектараў міліцыі, умацаванні кадравага патэнцыялу і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння службы»... Перад тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў пастаўлены канкрэтныя задачы па аптымізацыі аператыўна-службовай дзейнасці, павышэнні прафесійнага ўзроўню ўчастковых інспектараў міліцыі.

У прыватнасці, рашэннем калегіі прадпісана з улікам асаблівасці тэрыторый прыняць меры па выключэнні становішча, калі ўчастковыя інспектары міліцыі выконваюць неўласцівыя для іх функцыі і абавязкі, спыненні практыкі даручаць для разгляду заявы і паведамленні аб злачынствах, учыненых ва ўмовах невідавочнасці; сумесна з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі закончыць фарміраванне саветаў грамадскіх пунктаў аховы парадку і іх матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне.

У адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства ўнутраных спраў, назначэнне супрацоўнікаў у службу ўчастковых інспектараў міліцыі, а таксама перамяшчэнне такіх супрацоўнікаў, калі яны праслужылі ў гэтай службе менш за тры гады, у іншыя падраздзяленні здзяйсняецца толькі па ўзгадненні з намеснікамі начальнікаў галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, упраўленняў унутраных спраў аблвыканкамаў — начальнікамі міліцыі грамадскай бяспекі і ўпраўленняў кадраў.

Меры, накіраваныя на павышэнне прэстыжу службы ўчастковых інспектараў міліцыі, прымаюцца таксама з боку кіраўніцтва краіны: па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у гэтым годзе ўсталяваная надбаўка да службовых акладаў участковых інспектараў міліцыі, участковых інспектараў па справах няпоўнагадовых.

...Пытанне эфектыўнасці службовай дзейнасці ўчастковых інспектараў міліцыі знаходзіцца на пастаянным кантролі Міністэрства ўнутраных спраў.

Намеснік міністра ўнутраных спраў Я.Я. ПОЛУДЗЕНЬ».

АЛЯКСАНДРАЎСКАЯ АГРАСЯДЗІБА

— Ціхенька, не рухайся і не палохайся — тады пчала не будзе кусацца, — Аляксандр Антаненка на маіх вачах змог пераканаць унука, якому і пяці гадоў няма, што самае галоўнае — не крычаць і не махаць рукамі ў момант, калі пчала села яму на тварык.

Аляксандр-меншы прайшоў выпрабаванне з годнасцю. А я тым часам перажывала, што паміж волі справакавала такую сітуацыю. Рэч у тым, што мы з Аляксандрам Антаненкам, гаспадаром аграсядзібы ў вёсцы Дабрынь Ельскага раёна, абыходзілі яго ўладанні і паступова дабраліся да пчол, дзе і адбылося невялікае здарэнне. Калі ўсё закончылася добра, мы разам вырашылі, што добры пераемнік справы дзеда расце, вытрыманы. Нават пчалы не спужаўся. Маленькаму Сашу вельмі падабаецца на сядзібе дзеда. І не толькі яму. Дачка з зяцем жывуць, лічы, побач, у Мазыры. Што такое 30 кіламетраў на машыне? Яны сюды прыязджаюць пастаянна, у тым ліку з сябрамі. Тут лінёў кілаграмовых можна за дзень вядро налавіць. Шлях сюды ведаюць ужо многія прыхільнікі адпачынку на прыродзе. Хоць будавалася сядзіба побач з уласным домам выключна для сябе і сваякоў. І цяпер, калі дом зарэгістраваны як аграсядзіба, гаспадар не ставіць мэтаю зарабляць на ім вялікія грошы. Калі атрымаецца нейкі прыробак, то і добра:

— Вялікі — і не трэба. Многа наведвальнікаў — гэта ж многа і клопату, — кажа. — Не думаў, не планаваў займацца такім відам дзейнасці. Для сябе рабіўся дамок і за свае грошы. А потым мне з райсавета прапанавалі заняцца гэтай справай. Падумаў — чаму б і не? Разавы падатак плачу — гэта 35 тысяч рублёў у год.

Разам з жонкай, дачкой і зяцем вырашылі паспрабаваць. Аляксандр Антаненка — па асноўным родзе дзейнасці загадчык спартыўнага сектара Дабрынскага культурна-спартыўнага цэнтра, — дом пабудаваў сваімі рукамі. Некалькі гадоў запар ездзіў грошы зарабляць на расійскія будоўлі. Потым узяўся за сваю. Зруб паставіў, вагонкай абшыў. І агратурызм у рэгіёне вырашыў развіваць на асабістым прыкладзе. Цяпер і гасцям ёсць дзе адпачыць і разгуляцца: не толькі караоке паспяваць, але і ў тэніс згуляць, рыбу палавіць, у лазні папарыцца, у басейн тут жа акунуцца (а калі зіма, то пры жаданні і ў палонку на сажалцы). А потым і гарбаты папіць пад мядок з асабістай пасекі.

— Прыязджаюць і ельскія, і мазырскія, — расказвае Аляксандр Антаненка. Пакуль нікакай рэкламы не было — едуць тыя, хто ведаюць. «Сарафаннае радыё» працуе. Адзін пабыў — іншым расказвае і прапануе.

— А што, патрабаванні ў наведвальнікаў сядзібы вялікія?

— Я б не сказаў. Калі тэлефануюць, то пытаюцца, ці ёсць дзе паплаваць, рыбку палавіць (у мяне ў сажалцы рыбы багата: карп, карась, лінь). Душ — неабавязкова, а вось лазня — пажадана, каб была.

— Што для жанчыны можа быць прывабным у аграадпачынку?

— Мне здаецца, паплаваць, папарыцца, ды проста пабыць на прыродзе з сяброўкамі... Ёсць такія, што з парылкі не вылазяць. Звычайна прыязджаюць на выхадныя, у будныя дні рэдка. Пра гатоўку ежы дамаўляемся — у асноўным гатуюць самі: кухня асобная ёсць для гэтага. Тым больш пакуль кухара пастаяннага няма. Калі знойдзем такога — каб з душой, і смачна было, будзем прапаноўваць і адпаведныя паслугі. Мы з жонкай Лідай вырашылі развесці налета бройлераў — тэрыторыя тут дазваляе. Так што і птушка будзе да стала. Тут можна знайсці і сырадой, і смятанку, і тваражок — усё, што патрэбна адпачывальніку. Галоўнае, каб госці захацелі. На другім паверсе дома, бачыце — стол тэнісны. У марах і планах — більярд. Прыйдзецца прыбудову для яго рабіць.

— Дык на ўсё ж грошы патрэбны?

— Так, але ж да мяне з банка прыязджалі — даюць крэдыты льготныя пад 5 %. Чаму б не будаваць, не ўпарадкавацца? Цяпер вось трэба агароджу ўзвесці. Тут яшчэ шмат што не даведзена да ладу. Пакуль вады не зусім хапае. Але я думаю, што і гэта праблема вырашыцца.

Аляксандр першы з Аляксандрам другім.

— Вы разлічваеце, што вашы затраты можна акупіць праз пэўны час?

— Калі шчыра, я пра гэта не задумваўся. Усё тут я рабіў для сябе, бізнэс-плану не было.

Тым не менш, цяпер гаспадара аграсядзібы не задавальняе добраўпарадкаванне вакол дома. Кажа, гэта звычайны вясковы агарод. А хоча, каб было так, як па тэлебачанні паказваюць. Менавіта таму разважае, што трэба спецыялістаў па ландшафтным дызайне запрашаць, каб стварылі тут кветкавы цуд. Яшчэ адзін клопат — дзіцячы адпачынак. Людзі ж адпачываць прыязджаюць з сем'ямі, і кожнаму тут павінна быць утульна, лічыць Аляксандр Антаненка. Таму ў бліжэйшай перспектыве на прасторным участку абавязкова з'явіцца гамакі, арэлі і дзіцячыя пляцоўкі:

— Альтанку буду рабіць новую, пляцоўку для барбекю, невялікі басейн на вуліцы — для дзяцей. Мне гэта ўсё вельмі падабаецца. Жонка Ліда — самы галоўны памочнік. Я ж жыў і ў Піцеры, і ў Ельску, але вярнуўся туды, дзе нарадзіўся — у сваю вёску Дабрынь. Кожную раніцу выйду і гляджу: як у мяне пчолкі жывуць, як саджанцы развіваюцца. Вішня, груша, чарэшня, вінаград, абрыкосы, персікі... Я спачатку не ведаў, што ў нас не толькі абрыкосы, але і персікі выспяваюць — цяпер пераканаўся. Тут жа значна цяплей, чым паўсюль у Беларусі.

Пчолы — асобны клопат і асаблівая любоў. Аляксандр шмат гадоў марыў, але займацца імі пачаў толькі два гады таму:

— Пчалярства не кожнаму даецца. Яны ў мяне спачатку моцна раіліся — вопыту не было. Цяпер разумею, што трэба купляць іх у добрым гадавальніку — і з маладымі маткамі... Але ж гэта вопыт, які трэба прайсці. Так і з сядзібай.

Маленькі Саша ад дзеда Сашы не адыходзіць. Хіба толькі да бабулі Ліды. І яны разам не нарадуюцца на памочніка:

— З унучкам ходзім у спарткомплекс, трэніруемся. У свае 4 з паловай ён займаецца шашкамі-шахматамі, футболам і валейболам. Ён ад нас не хоча ехаць нікуды — такі вясковы хлопец. Дапамагае мне цвікі забіваць. Малаток і нажоўка — любімыя цацкі. У яго яны ёсць персанальныя.

Так што праблемы, у чые надзейныя рукі перадаць аграсядзібу, няма. Аляксандр Антаненка дадае, што згодны толькі, каб унукаў у яго было больш. А дзядулі хопіць на ўсіх.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ГАРАДЫ СТАЛІ БОЛЬШЫЯ

Зменены межы адразу чатырох гарадоў Брэсцкай вобласці — Бярозы, Белаазёрска, Пружан і Пінска. Адпаведныя змяненні датычаць і тэрыторый прылеглых сельсаветаў.

Так, у рысу горада Бярозы ўключана 80 гектараў зямлі Бярозаўскага сельсавета. У склад горада Белаазёрска Бярозаўскага раёна ўвайшло 113 гектараў плошчы Белаазёрскага і Пескаўскага сельсаветаў. Гэтыя землі будуць выкарыстаныя для кварталаў забудовы жылля.

Жыллё будзе ўзведзена і на 26,5 гектара зямель Пружанскага сельсавета, якія адышлі пад горад Пружаны. Пінск прырос адразу 274 гектарамі зямлі Пінскага раёна. Рэарганізацыя праведзена ў адпаведнасці з генеральным планам развіцця горада.

Яна СВЕТАВА.

«А ЯНО МНЕ ПАТРЭБНА?»

Чаму вяскоўцы стрымліваюць развіццё ўласнай гаспадаркі

Увёсцы Ларынаўка Аршанскага раёна чацвёра гаспадароў маюць моцную сялянскую гаспадарку. З прыбытку ад яе забяспечваюць дабрабыт сям'і. Усе чацвёра ўтрымліваюць невялікія свінафермы (па некалькі дзясяткаў галоў), даглядаюць жывёлу сем'ямі. У суботу і нядзелю гаспадары рэалізуюць мяса са свайго падворка на рынку.

Усе чацвёра — у росквіце сіл, да таго ж яшчэ адукаваныя і актыўныя ў грамадскім жыцці. Адзін з іх, Аляксей Шавялёў, у свой час закончыў вышэйшую навучальную ўстанову, атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка па сельгасмашынах. У маладыя гады паездзіў па гарадах і весях, а калі пасталеў, вярнуўся ў сваю вёску і паспрабаваў жыць са свайго падворка. Пачаў развозіць свіней і вырошчваць агародніну на продаж. Афіцыйна зарэгістраваны як фермер — вымушаны быў гэта зрабіць, бо па плошчы зямельнага надзелу яго гаспадарка ўжо выйшла за межы сялянскай.

Летась Аляксей Шавялёў дадаткова ўзяўся апрацоўваць 20 гектараў зямлі, каб забяспечыць сваю свінаферму кармамі. Яму далі няўдобіцы, зарослыя бур'яном. А сёлета на тым полі ён атрымаў 30 цэнтнераў збожжа з гектара. Сам апрацаваў зямлю, засеяў элітным зернем і сабраў ураджай на старэнькім камбайне, які вонкава выглядае прыгодным толькі на металалом, але ў гаспадарскіх руках працягвае служыць.

На сваім участку Аляксей Ільіч вырошчвае капусту і бульбу— тую агародніну, якая карыстаецца попытам на рынку і рэшткі якой можна выкарыстаць на корм жывёле. За дзясятак гадоў сялянскай працы ён упэўніўся, што гаспадарка рэнтабельная тады, калі паралельна з жывёлагадоўляй займацца і раслінаводствам. У такім выпадку часткова забяспечваеш статак кармамі ўласнай вытворчасці і ёсць шанц стабільна працаваць на прыбытак: летам — з гародніны, зімой — з мяса.

За гады такога гаспадарання Шавялёў пабудаваў дыхтоўны дом, набыў неабходную тэхніку. Заўважце, абжыўся матэрыяльна за 12 год цяжкай сялянскай працы. Таму і не спяшаюцца жыхары навакольных вёсак зарабляць на жыццё па яго прыкладзе, хоць і дом у Аляксея Ільіча прывабна выглядае, і падворак заможны. У той жа час Шавялёў упэўнены: калі б колькасць такіх гаспадарак павялічвалася, то і пагалоўе жывёлы на сялянскіх падворках вырасла б, і п'яніц ды беспрацоўных стала б менш, прычым без усялякіх адміністратыўных мераў.

— Пакуль вядзецца шмат гаворкі і робіцца мала спраў, каб палепшыць умовы для развіцця асабістых гаспадарак, — лічыць ён. — Напрыклад, каб далі крэдыт у банку, трэба мець паручыцеля. А дзе яго ўзяць? Людзі не хочуць браць адказнасць за чужую маёмасць і грошы. Са збытам сельгаспрадукцыі таксама няпростая сітуацыя. І вось што здзіўляе. Закупачную цану на тое ж збожжа за адзін кілаграм устанаўліваюць на дзяржаўным узроўні. Але калі я намагаюся прадаць збожжа, напрыклад, такому дзяржаўнаму прадпрыемству як папраўчая калонія, то мне прапануюць заплаціць за кі-

У першую чаргу трэба падумаць, як наладзіць забеспячэнне жыхароў пітной вадой, каб не вымяралі яе па літру. Але на пытанні вяскоўцаў ад уладаў пакуль няма адказу.

лаграм збожжа значна менш устаноўленай цаны. Калі буду пярэчыць і патрабаваць, дык зусім адмовяцца мець са мной справу. Нярэдка сутыкаешся з тым, што дзяржаўныя прадпрыемствы гатовы купляць збожжа і агародніну вялікімі партыямі ў сотні тон, а з дзясяткамі тон ад фермера ці гаспадара не хочуць звязвацца. І тады сялянскія гаспадаркі таксама маюць праблемы са збытам вырашчанай прадукцыі, а значыць, вымушаны прадаваць яе ніжэй устаноўленай закупачнай цаны.

Па-ранейшаму ёсць праблемы з забеспячэннем мінеральнымі тукамі, палівам — як фермераў, так і сялянскіх гаспадарак. Калі звяртаемся ў вобласць па гэтым пытанні, нас скіроўваюць у раённае ўпраўленне сельскай гаспадаркі. А там часцей за ўсё раяць, каб званілі вытворцам на завод самі.

— Каб абласныя ўладныя структуры лічыліся з фермерамі і сялянскімі гаспадаркамі, сёлета ў ліпені фермеры-актывісты Віцебскай вобласці збіраліся ў Полацку для вырашэння арганізацыйных пытанняў стварэння асацыяцыі фермераў, — кажа Аляксей Ільіч. — Я таксама ездзіў у Полацк. На сходзе мы акрэслілі кола пытанняў, якімі будзе займацца Савет асацыяцыі. Спадзяёмся, што вострыя праблемы фермерства і сялянскіх гаспадарак цяпер будуць актыўна ўздымацца ва ўладных структурах.

Выказаў свае меркаванні наконт жыццядзейнасці сялянскіх гаспадарак і Аляксандр Свіцін. Ён таксама жыве з прыбытку ад невялікай свінафермы ўжо з дзясятак гадоў. Паводле яго слоў, знарок стрымлівае развіццё сваёй гаспадаркі, бо не хоча дасягаць узроўню фермерскай. Задавальняецца невялікімі аб'ёмамі атрыманай прадукцыі (свініны), якую рэалізуе на гарадскім рынку.

— У мяне і так шчыльна заняты працоўны дзень. А калі займець статус фермера, то давядзецца пісаць справаздачы ў інстанцыі кожны квартал. А яно мне патрэбна? Дадатковай увагі і так дастаткова — ужо па той прычыне, што мы не працуем на дзяржаўным прадпрыемстве, а зарабляем на пражыццё са свайго двара. І па сутнасці, для большасці вяскоўцаў застаёмся «кулакамі», як абзывалі заможных сялян у пачатку мінулага стагоддзя. Ды і кіраўніцтву сельгаспрадпрыемства няма за што нас любіць — а раптам мы дарасцём да канкурэнтаў у пастаўках сельгаспрадукцыі і пацяснім дзяржаўнікаў?

У Ларынаўцы — недахоп пітной вады. Адна воданапорная вежа не спраўляецца забяспечваць вялікую вёску. А сельскі Савет не можа вырашыць гэтую праблему, бо няма сродкаў. Жыллёва-камунальная гаспадарка таксама распісваецца ў сваёй бездапаможнасці. Колькі зваротаў напісалі людзі па інстанцыях, і ўсё дарма. Каб напаіць жывёлу, Аляксандр Свіцін адпраўляецца па ваду да крыніцы ці да рэчкі са сваёй бочкай. Дык «добразычліўцы» на беразе калкоў натыркалі, каб не змог пад'ехаць і набраць вады...

Дарэчы, сёлета плануецца ператварыць Ларынаўку ў аграгарадок. Быццам бы ў першую чаргу пры гэтым трэба падумаць, як наладзіць забеспячэнне жыхароў пітной вадой, каб не вымяралі яны па літру, хто колькі выпіў. Але на пытанні вяскоўцаў наконт рэканструкцыі воданапорнай вежы ад уладаў пакуль няма станоўчага адказу.

Ну і, вядома, у цэнтры ўвагі — закупачныя цэны на прадукцыю. Калі яны дазволяць мець прыбытак, дык і сялянскія, і фермерскія гаспадаркі будуць расці колькасна. Пакуль закупачныя цэны на свініну, якія існуюць у райспажывецкім таварыстве і на мясакамбінатах, прапаноўваюць гаспадарам... быць стратнымі. Таму людзі самі гандлююць на рынку сваёй прадукцыяй. Толькі пры такой умове гаспадарка застаецца рэнтабельнай.

Вольга ШУТАВА.

МЯСЦОВЫ ЧАС

У «МІНІ-ПАЛІКЛІНІКУ» ПА ЗДАРОЎЕ

Як аграгарадкі паспрыялі вясковай медыцыне

На парозе ФАПа вёскі Сцяпанкі сустракаюся з пенсіянеркай Вольгай Гаўрылаўнай Малецкай. Жанчына прыходзіла па лекі для хворага мужа і спяшалася, каб аблегчыць яго боль. Фельчар Ала Юзвік развіталася з наведвальніцай і тут жа ўзялася кансультаваць па тэлефоне маладую маму.

Ала Віктараўна расказала, што аднагадовы Аляксандр Кот падхапіў, відаць, інфекцыю. У нядзелю ў дзіцяці паднялася тэмпература. Загадчыца ФАПа стабілізавала яе адпаведнымі прэпаратамі. Але ж мама Вольга вельмі непакоіцца.

Звычайныя клопаты вясковага медыка, якія ўжо сталі зместам жыцця Алы Юзвік. Яна працуе ў Сцяпанках два дзесяцігоддзі. У зоне абслугоўвання — дзесяць вёсак, каля 760 чалавек. «Калі толькі прыйшла на працу, — успамінае Ала Віктараўна, — аб'язджалі з санітаркай ветэранаў вайны, іх тады шмат было. І мяне вельмі здзіўляла, што сталая санітарка ведае ўсіх па імёнах, гаворыць з адным пра яго дзяцей, з другім пра нейкія жыццёвыя праблемы, і памятае ўсе іх балячкі. А цяпер мне знаёмыя ўсе пенсіянеры, без запінкі адкажу, які ў каго ціск, іншыя асаблівасці здароўя. Многіх тутэйшых жыхароў ведаю практычна з дзяцінства. Побач садок на 25 месцаў, кожны тыдзень яго наведваю, аглядаю дзетак».

Але ж галоўным прадметам гонару сцяпанкаўскага фельчара з'яўляецца сам будынак фельчарска-акушэрскага пункта. Два гады таму па праграме будаўніцтва аграгарадка ў Сцяпанках ФАП капітальна адрамантавалі і аснасцілі па-сучаснаму. Усё тут зэўра чысцінёй, прыгажосцю, утульнасцю. Ёсць працэдурны кабінет, абсталяваны кабінеты для прыёму стаматолага і акушэркі. ФАП адносіцца да Хмелеўскай амбулаторыі, раз на тыдзень на прыём прыязджаюць доктар-тэрапеўт, а таксама акушэрка і стаматолог.

Паводле слоў Алы Юзвік, у гэтае памяшканне на працу хадзіць хочацца. Мэблю, якая стаіць у холе, падарыла мясцовая гаспадарка. Нельга не заўважыць і добраўпарадкаванне тэрыторыі

Фельчар Сцяпанкаўскага ФАПа Ала ЮЗВІК.

вакол медыцынскай ўстановы. Роўная алея елак з цэментаванымі дарожкамі нагадвае дварысанаторыяў ці дамоў адпачынку. А перад уваходам — туі, кветкі, раўнютка падстрыжаны газон. «Елкі пасадзіла мая папярэдніца, — расказвае Ала.— Траву рэгулярна косіць муж. Ён пастаянна працуе на чыгунцы, але жонцы дапамагчы не адмаўляецца».

Загадчыца ФАПа паведаміла аўтару гэтых радкоў, што ёй як медыцынскаму работніку выдзелілі дом з так званых прэзідэнцкіх. А ў Сцяпанкаўскім сельскім Савеце мне расказалі, што сядзіба Юзвікаў адна з самых найпрыгажэйшых у вёсцы. І зрабілі яе такой гаспадары сваімі рукамі. Іх падворак з вясны і да позняй восені квітнее краскамі, муж і жонка ўпрыгожваюць дом і двор уласнымі вырабамі. Нядзіва, што і тэрыторыю ФАПа яны падтрымліваюць ва ўзорным парадку.

Скажу шчыра, у Сцяпанкі я заехала выпадкова, па дарозе за іншым матэрыялам. А калі назаўтра патэлефанавала намесніку галоўнага ўрача Жабінкаўскага РТМА Іосіфу Арлаўцу, ён вымавіў: «Правільна вы паехалі». Іосіф Юзэфавіч пацвердзіў, што сцяпанкаўскі фельчар — адзін з лепшых работнікаў сельскай медыцыны раёна.

У раёне зараз функцыянуюць дзесяць ФАПаў і пяць урачэбных амбулаторый. «Тое, што было гадоў пятнаццаць таму, — гаворыць Іосіф Арлавец, — адрозніваецца ад цяперашняга як неба і зямля. — Зараз у кожнай вясковай медыцынскай установе ёсць гарачая і халодная вада, пячнога ацяплення няма нідзе. І абсталяваны яны ўсе прыкладна так, як і ў Сцяпанках. Спярша рамантавалі, аснашчалі амбулаторыі ў Ленінскім, у Ракітніцы, у Крыўлянах, у Хмелеве, затым паступова і ў астатніх населеных пунктах. Усё гэта рабілася па праграме будаўніцтва аграгарадкоў. Так што аграгарадкі нам вельмі паспрыялі».

Пытаю, ці ўкамплектаваныя кадрамі вясковыя медустановы. Бо адна рэч — атынкаваць і пафарбаваць сцены, і зусім іншая — зрабіць ФАП сапраўднай міні-паліклінікай для вяскоўцаў. Аказваецца, у амбулаторыях і ФАПах поўны «камплект». Адна вакансія, якая была ў амбулаторыі, хутка закрываецца, бо ў вёску прыбывае ўрач-інтэрн.

18	участок № 6, в районе рынка «Быховский»	340100000006004313	0,0029	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона дренажного коллектора 0,0004 га.	5	486 922	95 148	9 500
19	участок № 7, в районе рынка «Быховский»	340100000006004314	0,0030	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализационного коллектора 0,0004 га.	5	490 836	98 429	9 800
20	участок № 8, в районе рынка «Быховский»	340100000006004315	0,0031	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализационного коллектора 0,0004 га.	5	490 836	101 710	10 100
21	участок № 9, в районе рынка «Быховский»	340100000006004316	0,0031	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализационного коллектора 0,0004 га.	5	490 836	101 710	10 100
22	участок № 10, в районе рынка «Быховский»	340100000006004317	0,0032	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализационного коллектора 0,0004 га.	5	490 836	104 990	10 400
23	участок № 11, в районе рынка «Быховский»	340100000006004318	0,0033	размещение торгового киоска		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализационного коллектора 0,0004 га.	5	549 197	108 271	10 800

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 30 сентября 2010 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16 при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.2 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.3 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.4 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 24 сентября 2010 г.** включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85.

Наш сайт: www.gorod.gomel.by.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

СУСЕДЗІ СУПРАЦЬ ПЧОЛ

Або чаму часам паміж людзьмі «несалодка» ва ўзаемаадносінах

Жыхар сталіцы, які мае ў Дзяржынскім раёне дачу, папрасіў удакладніць, якія дакументы рэгламентуюць утрыманне ў вёсцы пчол. Справа ў тым, што колькі часу таму з сельскага Савета яму даслалі афіцыйную паперу пад назвай «Акт-прадпісанне». У ёй, невялікай па аб'ёме (мы далей дадзім яе цалкам у пераказе), спасылаючыся на раней атрыманыя скаргі ад грамадзян з нагоды няправільнага ўтрымання ім, заяўнікам, пчол, гаварылася пра неабходнасць выканання палажэння аб іх правільным утрыманні. Г. зн. прапаноўвалася ўстанавіць агароджу не ніжэй за два метры. Або ўсё ж прадпісвалася? Праўда, ніякіх тэрмінаў і магчымых санкцый за невыкананне ўказана не было. Вось у чалавека і ўзніклі пытанні, тым больш што, паводле яго слоў, нейкай істотнай шкоды суседзям яго пчолы не нанеслі, за выключэннем, бадай, адзінага разу, калі яны ўджалілі некага з іх. Ну дык на тое ж пчолы.

…Сапраўды, летась шэраг пытанняў (магчымасць пасадкі пладовых дрэў каля агароджаў, вышыня гэтых самых агароджаў, утрыманне пчол) былі рэгламентаванымі. Нагодай для гэтага сталі шматлікія скаргі (увага!) членаў садаводчых таварыстваў. Таму і прынятыя новаўвядзенні датычыцца толькі гэтых самых садаводчых таварыстваў. У нас жа гаворка ідзе пра дачу, размешчаную ў вёсцы. Якія-небудзь дакументы агаворваюць «правільнае ўтрыманне» пчол у вёсцы?

— Калі зараз члены садаводчага таварыства сапраўды, каб завезці пчол, павінны атрымаць пісьмовую згоду ці не ўсіх суседзяў навокал, дык у вёсцы іх можна трымаць без абмежаванняў, — патлумачылі на наш запыт у РУП «Белпчалаводства». — Натуральна, ад скаргаў адзін на аднаго тут таксама ніхто не застрахаваны.

Карыстаючыся выпадкам, мы пацікавіліся: ці дапаможа новыя правілы ўтрымання пчол членам садаводчых таварыстваў, ці паменела з іх боку скаргаў?

— Недзе з 1955 па 1992 гады ў краіне налічвалася 600 тысяч пчаласем'яў, а зараз іх засталося 200 тысяч, а людзі не мірацца паміж сабой усё роўна. Ды не, колькасць скаргаў адзін на аднаго з гэтай нагоды за апошні час засталася прыкладна такой жа, як і была раней. Вы б ведалі, з якімі абсурднымі заявамі часам да нас звяртаюцца…

Каб канчаткова разабрацца ў сітуацыі, мы патэлефанавалі старшыні Станькаўскага сельскага Савета Людміле Шышко. Усё ж, што насамрэч азначаў той «Акт-прадпісанне», якое «палажэнне аб правільным утрыманні пчол» мелася на ўвазе? Гэтыя і іншыя пытанні напрыканцы размовы выклікалі ў суразмоўцы пэўнае раздражненне. «Ну мы ж яго не аштрафавалі!» — выказалася ў адрас заяўніка Людміла Канстанцінаўна. А наконт «палажэння» сказала, што адпаведныя тлумачэнні атрымала ад галоўнага ветурача раёна.

Мы мусілі звяртацца ўжо ў дзяржаўную ўстанову «Дзяржынская райветстанцыя». Галоўнага ўрача Аляксандра Рашэтніка спачатку не засталі на месцы, а калі патэлефанавалі крыху пазней, спецыялісты нам параілі па ўсіх пытаннях звяртацца ў… РУП «Беларускае пчалаводства», памылкова называючы прадпрыемства абласной структурай. Той жа суразмоўца, што і раней, пацвердзіў нам яшчэ раз сказанае дагэтуль і параіў больш настойліва дабівацца размовы з ветурачом раёна, маўляў, пытанне ў яго кампетэнцыі.

Калі дазваніліся да Аляксандра Міхайлавіча на мабільны, галоўным чынам паспрабавалі высветліць паходжанне згаданага ў паперы з сельскага Савета на адрас заяўніка «палажэння аб правільным утрыманні пчол». Кім, калі яно было прынятае? У вуснах суразмоўцы «палажэнне» пакрысе перайшло ў «рэкамендацыі». У рэкамендацыі пчаловадаў яшчэ тагачаснага СССР…

Спыніўшыся на гэтай дастаткова марнай спробе адшукаць спасылкі на нейкія заканадаўчыя акты, якія б рэгламентавалі ўтрыманне вяскоўцамі ці дачнікамі пчол, хацелася б сказаць колькі слоў пра іншае. Канфлікты паміж суседзямі былі, ёсць і, напэўна, будуць. Падаецца, што той жа сельскі Савет павінен быў і мог выступіць пасрэднікам у наладжванні добрасуседскіх узаемаадносінаў паміж людзьмі — няхай бы і пісьмова, але — праз «Запрашэнне да сустрэчы», напрыклад… Ды і самі суседзі не ў апошнюю чаргу маглі б паспрабаваць зрабіць крок насустрач адзін аднаму — за агульны стол з гарбатай пад духмяны мёд…

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЭРЦА МАЦІ

Мая гісторыя хутчэй сумная (толькі трохі смешная), але ж што праўдзівая — факт.

Было гэта пасля вайны. Год я дакладна не памятаю, але мы з братам (двайняты 1941 года нараджэння) у школу яшчэ не хадзілі — не было ў чым: дома бегалі ў доўгіх палатняных сарочках, а прыдбала маці (бацька з вайны не вярнуўся) нейкія штонікі са шлейкай праз плячо, дык мы, прабачце, як патрэба (малая ці вялікая), дык здымаем іх, кладзём на палок, а самі бягом за хату…

Рана ж такім у школу? Хоць настаўнік і прыязджаў да нас, казаў, што пара.

…Дык вось. У той дзень маці з нашай старэйшай (на тры гады) сястрою Валяй зазбіралася ў лес па ягады: схавала недзе запалкі, пакінула што з яды, сказала нам, калі з'есці…

Але ж будзем мы тое слухаць, калі галодныя, лічы, увесь час! Ды і розум які? З'елі ўсё падчыстую, — яны ў лес не паспелі зайсці!

Гойсаем сабе далей — нейкую кацёлку па дарожцы ганяем. Гадзіну, другую. Кішкі зноў марш іграюць. Прыбягаем удвух у хату — там, ведаем, у печы юха стаіць (у нас так суп называлі — з накрышанай у ваду бульбы… І добра, калі прышчымлены, хоць здорам…). Але як яе дастаць?.. Вілкамі ж мы чыгунок не падчэпім!

Што ўдумалі — сцягнулі з палка сяннік (нічога болей ні пад бок, ні пад галаву ў нас не было — вёску дашчэнту спалілі), усцягнулі краем на прыпечак.

У печ, да чыгунка, брат па ім першым палез, ён быў худзейшы за мяне і спрытнейшы. Я яго ў зад падапхнуў. Сам вонкі стаю, чую, як ён з гаршчэчка накрыўку скінуў, як есці пачаў. І мне хочацца — аж канцы прыходзяць. Кажу: «До ўжо табе. Усе крышаны павыліўліваў…». А ён у адказ: «Не бойся, хопіць і табе».

Але ж з печы праз нейкі час вылез. Гляну я на яго і ледзьве прыснаў — так ён у сажу спэцкаўся! Чорны, як тая засланка!

Аднак спыніць мяне гэта не магло: палез да чыгунка і я. Паглядзеў — юхі там няшмат засталося, пакідаць не было чаго, усё і прыкончыў, патэльнечкай зверху накрыў — парадак. Панесліся з братам далей гуляць.

Але ж вінаватыя, кары баімся. Бачым — з ягад нашы ідуць. Мы ў хату з братам — і на печ. Зашылі ся там і сядзім, як мышы пад венікам. «Чаго ўжо сцішыліся, — маці з парога пытае, — што ўтварылі?». Маўчым. А яна каробку з плячэй скінула, аддыхалася крыху і да печы. Чуем, бразнула засланкай, вілкі ўзяла, каб дастаць чыгунок, відаць, паднатужылася, а гаршчок аб скляпенне ляп — ведама парожні… Маці: «А дачушка мая! А што ж табе з'есці даць? Яны ўсё змалацілі, ірады!». І потым да нас — з крыкам: «А згубіцелі, а зладзеі, арыштанты…»

Брат — ведама, спрытнейшы і хітрэйшы — у дзірку за комінам шмыг, на падлогу скок і ў дзверы. А мяне матуля ўвабрала — надавала кухталёў, адвяла душу, ды так, што я зроўся ўвесь…

А потым і яна давай плакаць, давай убівацца, давай грудзі сабе рваць — як бы шукаць сэрца і прыказваць: «А дзе ж яно падзелася? А чаму ж яно такое трывушчае — чаму не зойдзецца, чаму не заціхае?..»

Мы з сястрой адразу сціхлі — глядзелі на яе.

Маці, убачыўшы гэта, устала, выцерла твар, падпаліла ў печы, зрабіла нейкай яды. Клікала да стала і мяне, але я не пайшоў, хоць і вельмі хацелася…

З таго дня прайшлі дзесяцігоддзі, мне ўжо пад 70, і я так лічу: жыць цяпер можна, толькі не дурыся, не лянуйся, не ляжы пад плотам. Рабі, і ўсё будзеш мець! Толькі б здароўе! І толькі б не было вайны!

Уладзімір Францавіч Астаповіч,
в. Рудня, Слуцкі раён.

СІЛА СЛОЎ

Не сакрэт, што мы, беларусы, гаворым на трасянцы, блізкай да рускай мовы. Калі ж чуецца беларуская, — словы набываюць незвычайную сілу.

Ну вось, напрыклад. Працуем мы ў лесе. Там жа — палуднуем. Потым, што называецца, прымаем са «стала». Куды? Пластыкавую бутэльку, потым газетны камячок (з загорнутым шалупіннем ад яек) адзін з нашых — Лёха — кідае ў траву.

Гляджу на яго і кажу (па-беларуску):

— Дрэнна робіш… Толькі свінні так — дзе ядуць, там і гадзяць…

— Я что? Я ничего. Все ж сорят, — адказвае Лёха.

Я маўчу. Ён, відаць, думае, бо хвілін праз пяць падбірае смецце і са словамі: «Які ты праціўны, Іванавіч», кладзе ў сумку, каб выкінуць, там, дзе можна. З чыстым сумленнем.

Аляксандр Матошка,
в. Янкавічы, Расонскі раён.

ГЕРОЙ НАШАГА ЧАСУ

…Мусіць, ніхто так не любіць тэхніку, як мой знаёмец Рыгор! Ён шафёрам працуе, і машына ў яго ў самым найлепшым стане — заўсёды, чаго б ні каштавала!

Вось і ў той дзень ён рамонтам займаўся — выкачаўся пад «ластаўкай» сваёй, вымазаўся, але ж да розуму такі давёў: вылізаў, можна сказаць! Хоць і спэцкаўся: родная жонка можа не пазнаць.

Але ж гэта не бяда яшчэ: жонцы, калі што, і прадставіцца можна. Тут другая турбота: ехаць да яе трэба на ўласным аўто. А яно ж таксама блішчыць — і ўнутры, і звонку, а зменнага адзення Рыгор не браў. Як на тое ліха, нават падсцяліць няма чаго! Што рабіць?

Як і варта было чакаць, выйсце чалавек знайшоў. І як быццам добрае. Калі б не тая ж жонка: ён якраз да крамы даехаў, а тут яе званок — зайдзі, маўляў, хлеб у хаце канчаецца.

Рыгор (жонку ж нельга не слухаць!) адразу па тармазах, спыняецца ля той крамы, адчыняе дзверцы, вылазіць, як усе кіроўцы, бакавым зрокам бачыць, колькі людзя ганку… І усе чамусьці глядзяць на яго…

Што нармальна, як быццам?

А ненармальна, што ён крок зрабіў, а другі ўжо і не можа — перашкаджае штось… Як бы путы…

Зірк уніз — яны самыя!

Каб сядзенне не спэцкаць, ён… порткі на калені спусціў. А падцягнуць забыўся. Вось яны і аб'ехалі…

Так што добры дзень у чалавека выдаўся: адну машыну паправіў, другую не спэцкаў, хлеба купіў і людзей пасмяшыў. Ну чым не герой?!

Галіна Бабарыка,
в. Мачуль Столінскі раён.

АЎТАРЫТЭТ

Хто пра што, а я пра Лучын, пра вёску сваю — дзе птушка радзілася, там і куст міл…

Той самы 12-кілаграмовы кавун і карнаваная агародніца.

То каб ведалі: аўтарытэт — хоць у чым — у нас займець можна. Але гэта складана, нават вельмі складана, бо ў Лучыне аўтарытэтаў… Ды кожны… Хоць і сам сабе… А таму да новага — ну пакуль прысвоіць — будуць доўга прыглядацца, сумнявацца… Але затое потым дазволяць чалавеку ўсё: ну як ён робіць, так і трэба, так і правільна!..

Я пра «карону» (а тым больш у агародніцтве) ніколі не думала: проста сеяла, палола, палівала і назірала — набывала веды. А «бабскае радыё», яно ж ведае ўсё. Гадоў дваццаць таму ў выхадныя ці святы лучынскія жанкі па межах хадзілі — глядзелі, у каго, што і як. Крый Бог, каб недзе тады пустазелле буяла! Адна адной адразу ж перакажуць: «Ты яшчэ не бачыла? То скадзі, паглядзі». Неахайніцы тады хоць у пельку лезь — ганьба. На ўсё сяло…

А можа быць і гонар!

Пра свой я стала здагадвацца, калі тыя ж «эксперты» пачалі ў мяне пра нешта пытацца, прасіць парад. Я і цяпер не ўсё ведаю, а дваццаць гадоў таму… Але ж у нашым Лучыне не так «паложана»: калі далі табе карону, то будзь ласкавы — насі. І адпавядай. Вось я і старалася — рассыпала тыя парады направа і налева, нават у смак увайшла. Карацей, падыходзіць неяк адна з нашых бухгалтарак, пытаецца:

— Слухай, а радыску сёння пасеяць можна?

Я, што называецца, пальцы ўроскідку і выкладаю, што, маўляў, радыска не дэбет з крэдытам і не сальда-бульда, тут усё трэба ўлічыць, а не проста насенне ў радок насыпаць. Ну па-першае, гэта культура кароткага дня… А па-другое, самы маладзік цяпер. Значыцца, справы дрэнь: радыску можна і не сеяць — усё роўна ў ствол пойдзе.

Тома выслухала мяне, можа, нават згадзілася (не сеяць), і з належнай мне павагай пытае:

— А ты сваю ўжо даўно ясі? Ці добрая ўдалася?

Свайго адказу я і сама не чакала (ну магла ж збрахаць!):

— Не ведаю, — кажу, — учора пасеяла, сёння яшчэ не глядзела.

Рагаталі разам. І невядома яшчэ, хто больш… У тым ліку потым, бо варта было некаму пра нешта ў мяне спытаць (нават пра шкодніка) Тамара тут жа «забягала» наперад, казала: «У ствол пойдзе!».

…Так было доўга: аж пакуль яна не з'ехала — у Адэсу, на пастаянае жыхарства.

Гадоў праз колькі засумавала, наведала радзіму. Ну і да каго ж тады, як не да лепшай сяброўкі (да мяне, значыць)? І куды? Вядома, у агарод.

Год тады выдаўся добры, таму, убачыўшы мае кавуны, Тома, што называецца, «выпала ў асадак» (нават пра «ствол» забылася), сказала:

— У мяне ў Адэсе такіх няма…

У гэтым годзе самы вялікі кавун мой заважыў больш за 12 кіль. Ён ужо разрэзаны і з'едзены. Вядома ж, не самой, бо, як кажуць, з'еш адзін хоць вала — адна хвала. Людзі памаглі — набліжаныя. Смак быў — проста а-бал-дзець!

А што да парад, то я іх раздаю па-ранейшаму. І доследы раблю: век жыві — век вучыся. Капусту вось сёлета пасадзіла на поўні. Пабачу, што выйдзе (галоўнае — назіраць за ёй. А рады даць заўсёды можна)…

Адно — ніколі і нічога не трэба садзіць і сеяць у дабравешчанскі дзень тыдня. Гэта я аўтарытэтна кажу, бо праверана. І не адзін раз. А яшчэ дасылаю здымкі кавуноў, каб ведалі: карону ў Лучыне проста так нікому не даюць.

Соф'я Кусянкова,
Рагачоўскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР

P.S. *На адным з нашых беларускіх тэлеканалаў, кажуць (сама, на жаль, не бачыла. — **В.Д.**), сюжэт быў пра тое, што вырошчваць кавуны ўзяўся знакаміты агракамбінат «Ждановічы». І вучоны аграном там скардзіўся, што не дужа ўрадзілі, бо досведу пакуль няма — у фірмы. А ў нашых падпісчыкаў, як высвятляецца, ёсць!.. Ды яшчэ і які! І досвед… І аўтарытэт… І жыццёвая мудрасць… І дабрыня… А ўжо гумар, мова!..*

То далучайцеся — выпісвайце найстарэйшую беларускую газету! І, зразумела ж, пішыце.

P.P.S. *Асобны дзякуй аўтару першай, як сам прызнаў «толькі трохі смешнай» гісторыі Уладзіміру Францавічу Астаповічу… Яшчэ і за словы: за «штонікі са шлейкай праз плячо», за «кацёлку на дарожцы» (драўлянае кола, якое качаюць дзеці дзеля забавы. Тут і далей паводле слоўніка. — **В.Д.**), за палок (нары паміж печчу і ложкам, або паміж печчу і супрацьлеглай сцяной уздоўж глухой сцяны ў сялянскай хаце), за прышчымленую (аканіце! бо бывае нішчымная, не прыпраўленая скаромным (мясным ці малочным…) юху), за здор (нутраное свіное сала), за сяннік (матрац, набіты сенам ці саломай), за крышаны (адрэзаны, плоскі кавалак чаго-небудзь; бульбяны суп), за засланку (прыстасаванне — звычайна бляшаны ліст з ручкай — якім засланяюць топку печы)…*

За вяртанне ў перажытае (на шчасце, не ўсімі). Якое, дасць Бог, ніколі не вернецца!

Ад усёй душы цёпла і сардэчна **віншуем Івана Канстанцінавіча МАЛЯЙКОВІЧА з 75-годдзем**!

Вас поздравляя с юбилеем,
Стремясь к возвышенным словам,
Мы скажем просто, как умеем:
«От всей души спасибо Вам!».
За благородство мыслей Ваших!
За мир Ваш светлый и большой!
За то, что став немножко старше,
Вы молодеете душой!
За то, что в жизненных вопросах
Вы — наша совесть, ум и честь!
А если просто в плане тоста:
За то, что Вы на свете есть!



З павагай і любоўю жонка, сын, нявесткі, унукі, іх сем'і, усе родныя і блізкія.

НАВАСЕЛЛЕ Ў ПАРЫТЭТБАНКУ

Днямі ў сталіцы па вуліцы Кісялёва, 61а адчыніўся новы галаўны офіс ААТ «Парытэтбанк». Цяпер кліенты змогуць ацаніць не толькі зручнасць пры здзяйсненні плацяжоў гэтага банка, але і яго прывабнае размяшчэнне.

— Новы офіс дасць магчымасць працаваць з кліентамі на новай аснове, — упэўнены **старшыня Назіральнага савета ААТ «Парытэтбанк», намеснік старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Мікалай Лузгін.** — Сфера банкаўскіх паслуг развіваецца сёння вельмі дынамічна, таму вельмі важна ў гэтай справе знайсці сваю «разынку». Наш козыр — у новых тэхналогіях, якія прымяняюцца ў тым ліку і ў банкаўскім бізнэсе.

Дзякуючы навейшым тэхналогіям, распрацаваным у Парытэтбанку, кліенты маюць магчымасць ажыццявіць усе неабходныя ім аперацыі — у любым месцы, дзе б яны ні знаходзіліся. Парытэтбанк прапаноўвае рабіць неабходныя плацяжы праз аддалены доступ.

Парытэтбанк — адзін з першых, хто пабудаваў у сваім памяшканні адмысловы ліфт-пад'ёмнік для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Цяпер для таго, каб здзейсніць плацёж альбо іншую банкаўскую аперацыю, такім людзям не трэба кагосьці прасіць — яны могуць зрабіць гэта самі.

ЗРУЧНАСЦЬ, ДАСТУПНАСЦЬ І АПЕРАТЫЎНАСЦЬ

Менавіта на гэтыя складнікі робіць упор Парытэтбанк. І не памыляецца: тут добра развітае дыстанцыйнае абслугоўванне кліентаў, укаранёныя навейшыя інфармацыйныя тэхналогіі: аўтаматызаваная сістэма сканавання і штрыхкадавання, інтэрнэт-банкінг для фізічных і юрыдычных асобаў. Паслугі можна аплаціць з дапамогай сістэмы ЕРЫП, сістэмы мабільных плацяжоў iPay, сэрвіса «Аўтааплата»… Усё гэта дазваляе скараціць да мінімуму час, неабходны для здзяйснення якой-небудзь аперацыі, і забыцца на чэргі.

Адна з апошніх тэндэнцый у банку — гэта рост аб'ёму ўкладаў насельніцтва. За перыяд са студзеня па ліпень ён значна павялічыўся. Захоўваць грошы ў банку цяпер стала яшчэ зручней і выгадней.

— На сёння назіраецца дастаткова хуткі рост зберажэнняў насельніцтва — больш за 22 трыльёны рублёў, — удакладняе **Мікалай Лузгін**. — У эквіваленце як беларускай валюты, так і замежнай. У асноўным гэты рост ідзе за кошт укладаў у беларускіх рублях.

— Аб'ёмы крэдытавання растуць, — тлумачыць Мікалай Лузгін. — Хуткімі тэмпамі працягвае расці крэдытаванне фізічных асобаў на будаўніцтва жылля. На наступны год у нас запланавана будаўніцтва 9,1 млн квадратных метраў жылля. Адпаведна растуць сумы льготнага крэдытавання.

— Палітыка нашай дзяржавы накіраваная ў першую чаргу на тое, каб людзям у ёй жылося зручна, — гаворыць **намеснік старшыні Праўлення ААТ «Парытэтбанк» Вячаслаў Коршун.** — Мы ў сваю чаргу працуем на мэтавую аўдыторыю — і наша задача ў тым, каб з найменшымі затратамі кліент атрымаў максімальна зручны прадукт.

Адзін з найбольш актуальных прыкладаў — укараненне ў Парытэтбанку праграмы хуткага крэдытавання. Сума крэдыту — ад 3 да 300 мільёнаў рублёў. Выкарыстанне гэтай сістэмы дае магчымасць прымаць рашэнні па крэдытаванні ў вельмі кароткі тэрмін: дакументы кліента сканіруюцца і ўтвараюць своеасаблівае крэдытнае дасье. У выніку візуальныя вобразы ўсіх дакументаў становяцца даступнымі не толькі крэдытным работнікам, але і службе бяспекі, юрыдычнай службе і, пры неабходнасці, службе залогу, прычым — адначасова. Таму чалавек, які звярнуўся ў Парытэтбанк адночы, у наступны раз можа быць упэўнены, што ўсё будзе зроблена яшчэ аператыўней: уласная электронная база сфарміравана і надалей. Зручна і кліенту, і супрацоўніку банка.

Гэта ў чарговы раз пацвярджае: банк арыентуецца найперш на стварэнне камфортных умоў абслугоўвання і індывідуальны падыход.

Ілья ЛАПАТО, Віктар ПАЗНЯКОЎ.
Здымкі з архіва банка.

Даведка

У студзені 2010 года ААТ «Парытэтбанк» завяршыла ўступленне ў Банкаўскую Асацыяцыю краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Banking Association for Central and Eastern Europe/ BACEE) на ўмовах рэгулярнага членства.

Членства ў BACEE адкрыта ўсім банкам з добрай рэпутацыяй, якія маюць на мэце развіццё супрацоўніцтва з замежнымі банкамі, выхад на міжнародныя рынкі, супрацоўванне новых банкаўскіх прадуктаў і тэхналогій.

ОАО «Паритетбанк», Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 5 от 27.10.2006 г., УНН 100233809.

Рэха публікацыі

«У гэтым чэрвені ўпершыню давялося ўласнаручна фабрыкаваць вынікі выпускных іспытаў»

Нашы матэрыялы датычна сумных вынікаў цэнтралізаванага тэсцірання і буфанады на выпускных іспытах у школе («Звязда» ад 31 ліпеня і 4 жніўня) выклікалі проста мора водгукаў чытачоў. Паказальна, што ніводзін з іх не абвяргае нашых высноў: школьныя выпускныя іспыты шмат дзе пераўтварыліся ў тэатр, усе на іх спісваюць, і ўсе пра гэта ведаюць. А на цэнтралізаваным тэсціранні адразу робіцца бачнай рэальная карціна: 10, 12, 15 балаў са 100…

Даваць усе водгукі — не хопіць месца ў газеце, таму прывядзём тры яскравыя: двух настаўнікаў і былой студэнткі педуніверсітэта. Водгукі не ананімныя — імёны аўтараў ёсць у рэдакцыі. Але, каб не нашкодзіць ім, прозвішчы не называем.

Мой электронны адрас — labadzenka@gmail.com

Чакаю вашых новых водгукаў па тэме.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

@

«Пасля педнарадаў хочацца памерці…»

«Дзень добры, шаноўная рэдакцыя газеты! Я — настаўніца сельскай школы з 16-гадовым стажам. Не ўтрымалася, каб не напісаць колькі радкоў з нагоды вашага артыкула пра сітуацыю ў нашай сярэдняй адукацыі. Сапраўды, усё, што пішуць людзі, якія працуюць у школе, а таксама іх сваякі — 100 % праўда!!! Калі 15-20 балаў — гэта нармальна, то для чаго тэсты разлічаныя на 100 балаў, і чаму на нас пастаянна сварацца і «дзяўбуць» за такія балы нашых вучняў?! Ну а пра сярэдні заробак настаўнікаў — гэта ўжо занадта. Я пра такі толькі марыць магу! Працуючы на 18 гадзінах, атрымала мільён «адпачынкавых» (маю двух дзетак-школьнікаў, мужык атрымлівае прыкладна столькі ж). Вось і лічыце наш настаўніцкі заробак. Вось і пражывіце на яго — есці, апранацца, рабіць рамонт, адпачываць і гэтак далей — карацей, радуйся жыццю. Натуральна, што любы чыноўнік будзе бараніць свой «мундзір». Якія ж яны далёкія ад рэальнай школы… Мая мама таксама настаўніца, цяпер ужо на пенсіі, займаецца рэпетытарствам. Заўжды аддавалася працы «па поўнай». Маладыя настаўнікі па-добраму зайздросцілі ёй: у яе вучняў вялізны працэнт паступальнасці ў прэстыжныя ВНУ. На пытанне, як ёй гэта ўдаецца, яна заўжды адказвала: «Дзяўчаты, так працаваць, як я, вам нельга, вы маладыя, у вас сем'і, вы, дзякуй Богу, пакуль што здаровыя — глядзіце сябе і сваю сям'ю. А я, такая добрая настаўніца, нічога, апроч сціплай пенсіі, не набыла, ды і сына свайго «ўпусціла».

Сапраўды, у настаўніка практычна няма часу на сям'ю, адпачынак. Для вучняў існуе дазіроўка хатняга задання. Тады чаму нікога не хвалюе перадазіроўка настаўніка?! Ён жа не робат! Пасля педнарадаў хочацца проста памерці, каб не было праблемаў, УСЕ з якіх ты ўсё адно не здольны вырашыць.

Пра маладых спецыялістаў (большасць з тых, што прыходзілі да нас у школу): паводле іх слоў, яны «адбываюць двухгадовы тэрмін пакарання». Ведалі б вы, чым яны часам займаюцца на ўроках з вучнямі… Якая ўжо там падрыхтоўка да ЦТ…

І яшчэ. Магчыма, так мяркуюць яшчэ не ўсе настаўнікі рэспублікі: «Калі дзяржава лічыць, што яна нам дастаткова плоціць, то мы будзем рабіць выгляд, што мы працуем».

Галіна К.

@

«Што трэба зрабіць, каб выгналі з «педа»?..»

«Мяне аж дрыжыкі прабіраюць, калі я такое чытаю! Сама правучылася ў «педзе» 3 гады, пакуль не паступіла, куды хацела — і з маіх знаёмых студэнтаў толькі адна дзяўчынка пайшла сюды, бо хацела (і тое не настаўнікам быць, а займацца фалькларам). Астатнія кудысьці не паступілі альбо ведалі, што не паступяць. Першыя два гады ў мяне былі амаль усе дзясяткі, прытым што да экзамену я рыхтавалася максімум два дні. Дзяўчаты ў нас з'язджалі працаваць у Турцыю на два месяцы пасярод семестра (!!!) — і ніхто іх не адлічаў! Што трэба зрабіць, каб выгналі з «педа»? Не магу прыдумаць! 80 % студэнтаў — гэта дзяўчаты, якіх хвалюе толькі, як бы падчапіць якога-небудзь хлопца з мінскай прапіскай і набыць джынсы, як у тэлезоркі. Гэта актыўна нядатная частка насельніцтва!..»

Каляда.

@

«Я асвойваю прафесію педагога ці прафесію бюракрата-авантурыста?..»

«У гэтым чэрвені ўпершыню давялося ўласнаручна фабрыкаваць вынікі выпускных іспытаў. Атрымалася ганебна спраўна… Але адміністрацыя школы нарэшце зірнула як на «свайго чалавека», а дырэктар асабіста намякнуў, што, нягледзячы на ранейшыя грахі маладога настаўніка, мабыць, яшчэ на год падпіша са мной кантракт…

Нібыта і ваўкі сытыя, і авечкі цэлыя — можна спакойна ісці на 56 дзён летняга адпачынку. Але вы закранулі гэтую тэму — і нешта падступіла да горла… Я асвойваю прафесію педагога ці прафесію бюракрата-авантурыста, калі «падганяю» паказчыкі тых жа іспытаў або складаю масу непатрэбных справаздач, матываваны хіба што магчымасцю акуратнай і немінучай расправы з боку непасрэднага начальства? А ў раёне — дзяжурныя метады: не заключыць новы кантракт, спаслаўшыся на колішнія промахі настаўніка, або даць катастрафічна малую колькасць гадзін, каб «нязручны» спецыяліст сам уцёк ад вельмі верагоднага жабрацтва, пакінуўшы рукі дырэктара чыстымі…

Прыйшоў працаваць на дзяцей, на будучыню нацыі, а працую на паспяховую справаздачнасць раённага метадычнага кабінета…»

Рыгор.

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 30 (362)

«ЧЫГІРСКАЯ ГАРБАТА» З БЯДРЫНЦА

«Садавод-аматар даў мне для пасадкі расліну бядрынец, сказаў, што вельмі карысная. Раскажыце пра яе асаблівасці». Мікалай ІВАНОЎ, Карэліцкі раён.

У прыродзе налічваецца да 150 відаў гэтай расліны.

Відаць, самым распаўсюджаным у нашай мясцовасці з'яўляецца бядрынец камняломкавы. Народная назва: дзягільнік, козлікі, казёл, зубны корань, сардэчная трава.

Шматгадовая пахучая травяністая расліна. Корань чырвонабурага колеру, таўшчынёй каля 1,5 см. Сцябло тонкарабрыстае, зверху пакрытае кароткім пушком. Вышыня расліны 30—60 см. Кветкі дробныя, белыя, сабраныя ў складаныя шматпрамянёвыя парасонікі. Плады голыя, дробныя яйкападобныя двухнасенкі бурага колеру, пасля выспявання распадаюцца на два рабрыстыя паўплодзікі.

Расце на супясчаных і сугліністых сухіх і камяністых глебах, у светлых сасновых лясах, на ўзлесках, палянах, абапал дарог, на пустках. Бядрынец камняломкавы — расліна святлолюбівая, непатрабавальная да ўмоў пражывання, засухаўстойлівая і зімастойкая. Яго можна вырошчваць у вазонах, у скрынях на балконе, за акном. Аднак у гэтым выпадку рэкамендуецца вырошчваць як аднагадовую культуру.

Пах у бядрынца слабы, мускусны, смак даўкі, крыху асвяжальны. Цвіце ў ліпені-жніўні, плады выспяваюць у жніўні-верасні.

СПОСАБ НАРЫХТОЎКІ

Карані выкопваюць у верасні-кастрычніку, пасля таго як расліна адцвіце, або ранняй вясной, абтрэсваюць ад глебы, прамываюць халоднай вадой, разразаюць на кавалкі. Сушаць у цяні, на скразняку. Тэрмін годнасці сыравіна 3 гады. Сыравіна мае моцны востры, саладкаваты смак. Лісты нарыхтоўваюць пастаянна. Збіраць і сушаць таксама ў цяні.

У лекавых мэтах выкарыстоўваюцца карані. Прымяняюць унутр і як вонкавы лекавы сродак. Дапамагае пры запаленні верхніх дыхальных шляхоў і галасавых звязак, як адхарквальны, супрацьзапаленчы і кроваачышчальны сродак. Выкарыстоўваюць пры бранхіяльнай астме, ангіне, хранічных гастрытах, хваробе нырак, пры рэўматызме і падагры, пры ацёках застойнага характару. Для лячэння гэтых хвароб выкарыстоўваюць адвары, настоі і настойкі.

Сок бядрынца выкарыстоўваюць як заспакаяльны сродак. Сок адціскаюць з сабраных у верасні-кастрычніку альбо ранняй вясной добра прамытых каранёў. Прымаюць па 1/2 чайнай лыжкі, разведзены мёдам у прапорцыі 1:3, тры разы на дзень да яды.

Свежыя лісты выкарыстоўваюць для прыгатавання салатаў, вінегрэтаў і супоў, а карані — для прыпраў да мясных, рыбных страў і страў з гародніны. З лістоў атрымліваецца выдатная гарбата (так званая «чыгірская гарбата»). Кветкі кладуць у расол пры засолцы, марынаванні агуркоў, памідораў. Настойкі з бядрынцам маюць своеасаблівы пах і смак. Насенне дадаюць у хлебабулачныя вырабы.

Яго любяць жывёлы на пашы і ў якасці сена. Прымесь бядрынца да травастою альбо сена абуджае ў жывёлы апетыт.

Расліна лёгка паддаецца культываванню.

ЯКІ САД БЕЗ ГРУШЫ?

«На дачным участку, які пачалі асвойваць у мінулым годзе, мы хочам пасадзіць сад, але ўсё адразу, відаць, не атрымаецца, і вельмі хацелася б, каб было некалькі гатункаў грушы, бо яе ў нас любяць усе. Падкажыце, калі ласка, тэрміны пасадкі грушы — увосень ці вясной?» І. Корань, Уздзенскі раён.

Яшчэ старажытныя грэкі называлі грушу ежай багоў. Акрамя таго, што грушы смачныя, яны яшчэ і карысныя.

— У пладах ёсць лёгказасваяльныя вугляводы, арганічныя кіслоты, Р-актыўныя рэчывы, клятчатка, — расказвае навуковы супрацоўнік Інстытута пладаводства, кандыдат сельскагаспадарчых навук, аўтар некалькі гатункаў груш Марыя МЯЛІК. — У грушы вітамінаў не так і многа, затое ў пладах выяўлены каштоўныя эфірныя алеі, фітанцыды, танін і іншыя карысныя рэчывы. Сярод мінеральных элементаў груша змяшчае калій, магній, фосфар, кальцый, алюміній, жалеза, марганец і іншыя элементы, важныя для жыццядзейнасці чалавека.

Сок і адвар сушаных груш добра наталяе смагу і прызначаецца для піцця пасляаперацыйным хворым. Адвар груш валодае абязбольваючымі, антысептычнымі і замацавальнымі ўласцівасцямі пры паносах. Яго прымяняюць пры запаленчых захворваннях кішэчніка. Вараныя і печаныя грушы прымяняюць пры моцным кашлі. Арбутын, які змяшчаецца ў пладах грушы, выводзіць з арганізма солі цяжкіх металаў. Тым, хто жыве ў экалагічна заб

ЧАМУ Ў МАШЫНЕ БЫЛА ЗБРОЯ, А ДОМА — ПАТРОНЫ?

На аўтадарозе Капаткевічы—Навасёлкі работнікі Ляскавіцкай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі Петрыкаўскага РАУС спынілі аўтамабіль ВАЗ-2108. Падчас агляду транспартнага сродку ў ім была знойдзена агнястрэльная наразная зброя неўстаноўленага ўзору з аптычным прыцэлам і два патроны калібру 7,62 мм. На месца выклікалі следча-аператыўную групу з райаддзела міліцыі, куды была перададзена зброя і боепрыпасы. А пры аглядзе домаўладання асобы, што кіравала аўтамабілем, былі яшчэ знойдзены боепрыпасы неўстаноўленага ўзору ў колькасці 23 штук.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ТАКСІСТ НАСМЕРЦЬ ЗБІЎ ДАРОЖНАГА РАБОЧАГА Ў МІНСКУ

Аўтамабіль таксі ўчора ўначы насмерць збіў дарожнага рабочага ў Мінску, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

ДТЗ здарылася ўначы — каля 0.45. Таксі «Опель» на вуліцы Валгаградскай, рухаючыся з боку вул. Кнорына ў напрамку вул. Кедышкі, наехаў на мужчыну 1986 года нараджэння — майстра дарожнай службы. Пры гэтым рабочы знаходзіўся на спецыяльна абазначаным участку падчас правядзення дарожных работ. У выніку аварыі ён памёр на месцы здарэння, а вадзіцель знік.

Цяпер праводзіцца вышук вадзіцеля таксі. УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама просіць усіх сведак, відавочцаў і асобаў, якія маюць якую-небудзь інфармацыю па месцы знаходжання гэтага вадзіцеля, паведаміць у міліцыю.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Условие продажи, целевое использование земельного участка и характеристика строения
1.	Право аренды земельного участка сроком на 50 лет	г. Гродно, пер. Победы, 5	0,5785	440100000001003727	271 172 000	27 000 000	Строительство и обслуживание объекта производственно-коммунального назначения.*

** с подробной информацией об условиях строительства объекта можно ознакомиться по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00, тел. (0152) 720546.*

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за право аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона на право аренды земельного участка обязан в течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации в городской бюджет.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 30 сентября 2010 года в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 26 августа по 24 сентября 2010 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by.**

Извещение о проведении повторных аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

Предмет аукциона	Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке					
	лот № 1	лот № 2	лот № 3	лот № 4	лот № 5	лот № 6
	ул. Ленина, 42 площадью 0,0537 га	ул. Гоголя, 42, 42/1, 44 и 46/1 площадью 0,2950 га	ул. Комсомольская, 5, 7, 7/1 и 9 площадью 0,2416 га	территория бывшего в/г № 2 «Южный» площадью 8,8797 га	ул. Коммунистическая, 20 площадью 0,2580 га	ул. К. Маркса, 95 площадью 0,0460 га
Функциональное назначение земельного участка	строительство и обслуживание административно-офисного здания с объектами торговли и соцкультбыта на 1 этаже	строительство жилых домов с объектами соцкультбыта на 1 этаже	строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже	строительство многоэтажных жилых домов повышенной комфортности	строительство и обслуживание объекта административно-офисного назначения	строительство и обслуживание объекта административно-торгового назначения
Срок аренды зем. участка	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет	5 лет
Объекты недвижимости, подлежащие сносу	- встроенные нежилые помещения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Ленина, 42; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул. Гоголя, 42, 42/1 и 46/1; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «ЖРЭУ г. Бреста» по ул.Комсомольская, 5, 7 и 9; - встроенные жилые помещения, находящиеся в собственности граждан	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. Коммунистической, 20; - сооружения по ул. Ленина	- здания и сооружения КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» по ул. К. Маркса, 95
Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой						
Наличие инженерных коммуникаций на зем. участках	централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети			электросети	централизованные водоснабжение, водоотведение, теплоснабжение и газоснабжение, электросети	
Начальная цена продажи (руб.)	17 261 186	74 301 958	55 590 033	1 483 104 521	85 842 521	15 217 969
Сумма задатка (руб.)	1 726 000	7 430 000	5 559 000	148 310 000	8 580 000	1 520 000
Расх. по подг. земел.-кадастр. документации, тех. условий, АПЗ (руб.)	3 209 628	5 890 116	5 890 116	4 591 398	5 236 639	3 479 946
Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям						
Восстановительная (остаточная) стоимость нежилых объектов недвижимости, руб.	43 489 485	5 021 967	65 959 082	3 522 682 742	-	-
Рыночная стоимость нежилых объектов недвижимости, руб.	-	-	-	-	127 891 787	382 419 000
Рыночная стоимость жилых объектов недвижимости, рублей/площадь	459 661 000 / 187,9 кв.м	681 064 000 / 277,6 кв.м	916 940 000 / 377,5 кв.м	-	-	-
Площади жилых помещений для возврата в гос. жил. фонд	-	382,3 – 497,3 кв.м	132,2 – 167,2 кв.м	-	-	-

Победитель аукциона обязан:

приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений);

передать в коммунальную собственность г. Бреста для отселения граждан жилые помещения типовых потребительских качеств, в соответствии с пунктами 44–46 Положения о порядке учета граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставления жилых помещений государственного жилищного фонда, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29 ноября 2005 г. № 565 «О некоторых мерах по регулированию жилищных отношений» на условиях ранее заключенных договоров найма жилых помещений;

предоставить взамен жилых помещений, находящихся в собственности граждан, жилые помещения, равноценные по благоустройству, по общей площади не менее ранее занимаемых, расположенные на территории города, либо по желанию граждан выплатить денежную компенсацию за принадлежащие им на праве собственности жилые и нежилые помещения.

Дополнительным условием для победителя торгов:

по лоту № 4 – разработка проекта застройки квартала № 2 в р-не Южного городка на зем. участке S=26.11 га в течение нормативных сроков, предусмотренных законодательством, с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте;

по лоту № 5 – разработка и согласование в установленном законодательством порядке генерального плана объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями в течение 2-х месяцев с даты проведения аукционных торгов; здания и сооружения по ул. Коммунистической, 20 находятся в безвозмездном пользовании у Управления Департамента исполнения наказаний МВД РБ по Брестской области до 31.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. №3-Б;

по лоту № 6 здания и сооружения по ул. К. Маркса,95 находятся в безвозмездном пользовании у УВД Брестского облисполкома до 30.01.2012 г. согласно договору от 01.02.2009 г. № 2-Б.

Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенная, банком копия платежного поручения о внесении задатка; **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; **представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель)** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10 % от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924. Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, на которых находятся объекты недвижимости, подлежащие сносу, вносят задаток в размере, установленном для объекта с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона обязан: ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации, тех. условий и АПЗ; ● заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка и договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) после выполнения условий, связанных с изъятием земельного участка, в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев с даты заключения договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений); ● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским горисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 30 сентября 2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 27.08.2010г. до 24.09.2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.
Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by

КУП «БРЕСТСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР ПО УПРАВЛЕНИЮ НЕДВИЖИМОСТЬЮ»

15 сентября 2010 года проводит повторные аукционные торги по продаже объектов недвижимости Пинского районного потребительского общества:

Лот № 1: капитальное строение (здание административно-хозяйственное с пристройкой и двумя холодными пристройками) с инв. № 130/С-31909 площадью 174,2 кв.м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Мебельная, 15 на земельном участке с кадастровым № 144500000015000037 площадью 0,0971 га, **с начальной ценой 32 869 800 руб., начальная цена снижена на 50 %.**

Лот № 2: капитальное строение (административное здание с двумя пристройками, гаражом, тремя складами, конюшней) с инв. № 130/С-28706 площадью 221,7 кв.м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, дер. Вишевичи, ул. Набережная, 70 на земельном участке с кадастровым номером 12548850110100042 1 площадью 0,1845 га, **с начальной ценой продажи 98 000 000 руб., начальная цена снижена на 35 %.**

Полная информация об аукционных торгах по тел.:
(0162) 23 81 92, (0162) 23 43 48
Сайт: bgcn.by, city.brest.by

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

Адрес участка/ кадастровый номер	ул. 2-я Белорусская, № 140100000001019335	ул. В. Интенационалистов, 19 № 140100000001019530	ул.В. Интернационалистов, 23 № 140100000001019531	ул. Волгоградская в районе рынка «Ковалево» № 140100000001020989	район индивидуальной застройки «Вычулки-Ямно» № 140100000001021585	район ул. Коммерческая № 140100000001022617	«ЮЗМР-4» № 18а по ГП № 140100000001022681	«ЮЗМР-4» №19а по ГП № 140100000001022682	«ЮЗМР-3»№ 68 по ГП № 140100000001025057	«ЮЗМР-3» № 67 по ГП № 140100000001025058
№ лота	1*	2*	3*	4*	5*	6*	7*	8*	9*	10*
Начальная цена продажи (руб.)	140 622 262	29 756 431	36 301 217	228 628 011	373 957 964	323 312 090	47 824 428	42 747 422	159 669 215	20 505 150
Сумма задатка (руб.)	14 000 000	2 975 000	3 630 000	22 862 000	37 395 000	32 330 000	4 780 000	4 270 000	15 966 000	2 050 000
Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.)	1 450 817	5 795 970	5 810 313	1 429 481	2 636 253	-	755 221	739 422	1 366 583	1 366 583
Общая площадь (га)	0,8704	0,0673	0,1056	0,4910	2,0631	1,7760	0,1234	0,1103	0,5793	0,0576
Срок аренды	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	25 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	строительство и обслуживание объекта торговли промышленной группой товаров	строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения	строительство логистического центра	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	строительство и обслуживание магазина продовольственных товаров	строительство и обслуживание бизнес-центра, гостиничного комплекса	строительство и обслуживание продовольственного магазина
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления	0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления	ограничений в использовании земель нет	0,0435 га – охранная зона газопровода высокого давления	0,3305 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 киловольт; 0,2105 га – охранная зона подземных кабельных линий связи; 0,0240 га – охранная зона воздушных и кабельных линий радиофикации	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет

Адрес участка/ кадастровый номер	«ЮЗМР-3» № 65 по ГП № 140100000001025060	в районе ул. Волгоградская № 140100000001025064	в районе перекрестка ул. Морозова и ул. Колесника № 140100000001025229	ул. Ясеневая № 140100000001025230	р-н Южного городка № 21 по ГП № 140100000001025533	ул. Шоссейная № 140100000001025536	р-н ул. Медицинская № 140100000001025537	ул. Строительная № 140100000001025532	ул. Осипенко № 140100000001025531
№ лота	11*	12*	13*	14*	15	16	17	18	19
Начальная цена продажи (руб.)	57 743 312	123 706 505	9 105 483	117 896 229	163 241 954	43 355 799	3 939 388	1 455 121	632 726
Сумма задатка (руб.)	5 774 000	12 370 000	910 000	11 780 000	16 300 000	4 335 000	393 000	145 000	63 000
Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.)	1 366 583	1 306 845	1 261 642	1 325 567	1 199 309	3 451 952	1 443 570	1 231 706	1 231 706
Общая площадь (га)	0,2095	0,2967	0,0600	0,3591	0,4439	0,1318	0,0100	0,0030	0,0015
Срок аренды	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет	10 лет
Целевое назначение	строительство и обслуживание торгового центра	строительство и обслуживание спортивных сооружений	строительство и обслуживание автомобильной мойки	строительство и обслуживание объекта торговли	строительство и обслуживание магазина промышленной группы товаров	строительство и обслуживание объекта многофункционального назначения	установка и обслуживание объекта торговли «Блинная»	установка и обслуживание торгового павильона	установка и обслуживание павильона по ремонту одежды
Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	0,0789 га – охранная зона санитарно-защитной полосы водоводов и водопроводов; 0,0206 га – охранная зона канализационных коллекторов	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет	ограничений в использовании земель нет

*** – повторные аукционные торги**

Дополнительное условие по лоту № 5 – возмещение потерь с/х производства в сумме 26 094 700 рублей, вызванных изъятием 2,0631 га пахотных земель; **по лоту № 6** – возмещение расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией в отношении создании земельного участка и потерь с/х производства в сумме 20 373 680 рублей

Условия продажи – внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещение расходов, связанных с подготовкой земельно-кадастровой документации и гос. регистрации в отношении создания зем. участков, по лотам 5, 6 возмещение потерь с/х производства; - заключение с Брестским горисполкомом договора аренды зем. участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении участка гос. регистрации прав на него; - начало освоения зем. участка в течение 6 месяцев с даты проведения аукциона и подписания протокола о его результатах; - получение в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - снятие плодородного слоя почвы и использование его для нужд, связанных со строительством объекта и на благоустройство г. Бреста

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»

Перечень документов, представляемый потенциальным участником аукциона: заявление на участие в аукционе; заверенная копия платежного поручения о внесении задатка; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. **Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Задаток в размере до 10% от начальной цены объекта перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012000002678 в филиале № 126 АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код 252, УНП 290433924.** Лицо, желающее участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона обязан: ● в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка осуществить оплату за аукционный объект и возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка; ● заключить с Брестским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка в установленные законодательством сроки; ● приступить к освоению земельного участка в течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка); ● по истечении срока аренды земельного участка, совместно с Брестским городским исполнительным комитетом, в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. Оплата за объект может быть произведена в рассрочку в соответствии с порядком, утвержденным решением горисполкома. **Победитель аукциона обязан** в течение 10 рабочих дней с даты проведения торгов возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 30 сентября 2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 605. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 27.08.2010 г. до 17.30 24.09.2010 г. по адресу: г. Брест, ул. Комсомольская, 46.
Контактные телефоны: 23 81 92, 23 45 56, 23 43 48. Сайт: bgcn.by, city.brest.by

А не шкодзь!

Два месяцы арышту за «рыбалку»

МЕНАВІТА такі вердыкт вынес суд Талачынскага раёна ў дачыненні да браканьера за здабычу рыбы забароненымі прыладамі лоўлі. Гэтае правапарушэнне ён здзейсніў на працягу года пасля накладання адміністратыўнага спагнання за аналагічныя дзеянні. Таму ў даход дзяржавы браканьер дадаткова ўнясе яшчэ 1,9 мільёна рублёў.

Падобным жа чынам павёў сябе і іншы грамадзянін: не зрабіў высноў з мінулага, зноў лавіў рыбу забароненымі прыладамі. У выніку па рашэнні Аршанскага суда быў аштрафаваны на 3,5 мільёна рублёў. А два браканьеры з Талачынскага раёна, хоць і ўпершыню трапіліся на вочы дзяржінспектарам з сеткамі, аднак паспелі нанесці шкоду прыродзе ў буйным памеры. За гэта суд даў ім адзін год умоўна са спагнаннем у даход дзяржавы 3,1 мільёна рублёў.

Калі ўрок не пайшоў на карысць...

НА трох браканьераў за незаконную здабычу рыбы менш года таму ўжо накладвалася адміністратыўнае спагнанне. Падавалася, урок трэба было б запомніць, ды дзе там...

У выніку за незаконную здабычу рыбы забароненымі прыладамі лоўлі суд Жыткавіцкага раёна вынес тройцы пакаранне: непрацуючаму грамадзяніну — штраф у памеры больш за 1,8 мільёна рублёў; рабочаму СВК «Скоўшын» Салігорскага раёна, раней судзімаму (судзімасці не знятыя і не пагашаныя) — папраўчыя работы тэрмінам на адзін год са штомесячным утрыманнем 15 працэнтаў заробку ў даход дзяржавы; пастуху той жа гаспадаркі, таксама раней судзімаму — штраф у памеры 1,4 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ТРЭЦІ Ў СВЕЦЕ

Па шашачнай кампазіцыі ім стаў звяздоўскі аўтар Віктар Шульга — неаднаразовы чэмпіён краіны, нацыянальны майстар спорту, майстар ФМЖД:

У 3-м чэмпіянаце свету ён заваяваў бронзавы медаль у жанры малых камбінацыйных праблем на 100-клетачнай дошцы і першым у нашай краіне сярод складальнікаў выканаў норму міжнароднага майстра. З чым мы яго шчыра віншуем! Паспяхова выступіў таксама Аляксандр Сапегін (Усполле Мсціслаўскага раёна), стаўшы майстрам ФМЖД, бо ён заняў высокае пятае месца. Акрамя іх, у шасцёрку прызёраў увайшлі: масквіч У. Матус (чэмпіён), літовец В. Бяляўскас (віцэ-чэмпіён), А. Маісееў з ЗША (чацвёртае месца) і М. Цветаў з Ізраіля (шостае). Дарэчы, Уладзімір Матус, Аляксандр Маісееў і Міхаіл Цветаў таксама беларускага паходжання.

У якасці нашага **бліца-56/1** пазнаёмцеся з адным з лепшых твораў В. Шульгі, які ў катэгорыі С атрымаў 70 ачкоў па змесце:



Белыя: 10, 26. 27, 31, 32, 35, 43, 44 (8). **Чорныя**: 7, 8, 12, 13, 23, 25, 36, 38, 42 (9). Выйгрыш.

Знакаміты маэстра знаходзіць час і для грамадскай дзейнасці: Ён з'яўляецца членам Камісіі па кампазіцыі Беларускай федэрацыі шашак і ФМЖД, цікава вядзе рубрыку «Шашкі» ў газеце «Культура». У яго і прафесія творчая: працуе майстрам па вырабе мастацкіх свечак Елісавецінскага манастыра, што ў Мінску.

АЎТАРСКІ-12/10

Гэты конкурс працягваецца праблемай-64 Пятра Шклудава (Наваполацк):

Белыя: a7, b6, c3, d2, d4, e3, h2 (7). **Чорныя**: a3, c5, e5, f4, f6, g3, g5, g7 (8). Перамога белых. Магчыма аформіць і ў эцюд:

Белыя: d2, e3, g1, дамка d8 (4). **Чорныя**: a7, f4, f6 g3, g5, g7 (6).

Пасля 1. gh2 вас чакаюць тры кампазіцыйныя варыянты.

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-7/17



Белыя: b6, c7, f4, g3 (4). **Чорныя**: a5, b2, b4, d2, h2, h4 (6).

Легальнасць зыходнай пазіцыі даказваецца. У белых на дзве шашкі меней, але за кошт першага ходу перавага... на іх баку.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

26 жніўня

Дзве даты

1880 год — нарадзіўся Гіём Апалінер (Вільгельм Апалінарый Кастравіцкі), вядомы французскі паэт беларускага паходжання — Кастравіцкія валодалі маёнткам Дарашковічы пад Навагрудкам. Пасля паўстання 1863-64 гадоў маёнтак быў канфіскаваны, дзед Гіёма эміграваў у Італію, там і прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады паэта. З 1899 года Апалінер жыве ў Парыжы. Удзельнік Першай сусветнай вайны. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1901 годзе. У многіх творах паэта прасочваецца духоўная сувязь са славянскімі краінамі (раман «Жанчына ў крэсле», апавяданне «Сустрэча ў Празе» і інш.). Пры ягоным жыцці выйшлі зборнікі «Алкаголь. Вершы 1898-1913», «Каліграмы. Вершы Вайны і Міру» і некаторыя іншыя. Шырокую вядомасць атрымаў раман Апалінера «Жанчына». На беларускую мову творы паэта перакладала Э. Агняцвет (зборнік «Зямны акіян»). Памёр Гіём Апалінер у 1918 годзе.

1945 год — 65 гадоў таму ў Мінску, у адпаведнасці з пастановай Дзяржаўнага Камітэта абароны, на базе аўтазборачнага завода пачата будаўніцтва Мінскага аўтамабільнага завода (МАЗ).

Цытата дня:

«Калі жанчына бывае да канца жанчынай, яна, несумненна ўяўляе большую каштоўнасць, чым калі іграе ролю мужчыны. Развіваць у жанчыне мужчынскія якасці, грэбуючы дадзенымі ёй прыродай — значыць, дзейнічаць ёй яўна ў шкоду».

Жан Жак Русо (1712—1778), французскі філосаф.

ПАСЛЯ ВЯНЧАННЯ

Паслядумка

Пасля вянчання ў храме нічога не пакідалі. Гэта прадпісанне сёння выклікае мноства самых непрадказальных непаразуменняў, у аснове якіх ляжыць няведанне традыцыі нашымі сучаснікамі і адсутнасць дакладнай інфармацыі (неабходных у гэтым выпадку карэктных тлумачэнняў з боку святароў) аб характары свяшчэннадзейства — шлюбу — і тых патрабаваннях, якія прад'яўляюцца з боку царквы.

● Акцэнтуем увагу на наступным: ручнік, на якім вянчалася сямейная пара, з таго моманту, як толькі на яго сталі маладыя, назаўсёды застаецца ў іх (як і вэлюм, вянчальныя свечкі, абразкі, якімі яны блаславіліся перад адпраўленнем у царкву) як сімвал іх сумеснай жыццёвай дарогі, як самы надзейны абярэг сямейнага шчасця, як галоўны сведка іх клятвы перад Богам не пакідаць адно аднаго ні ў шчасці, ні ў горы. Таму як толькі святар павядзе маладых да царскіх варотаў цалаваць абразы Багародзіцы і Хрыста, сваты або хросныя бацькі павінны тут жа згарнуць ручнік і не даць магчымасці літаральна нікому да яго дакрануцца.

● Аднак свет так уладкаваны, што за ўсё ў гэтым жыцці трэба плаціць: «За дабро дабром плацяць», або «Ты мне, я табе». Таму і храму трэба было абавязкова зрабіць рытуальны падарунак за выкананне таінства вянчання. Традыцыйна такім падарункам быў ільняны ручнік, у які загортвалі бохан свежага хлеба, пірагі, якое-небудзь іншае печыва, цукеркі і г. д.

● Затым маладыя выходзілі з храма. На парозе іх абсыпалі зернем, прысмакамі, манетамі, каб жыццё было шчаслівым і яны ні ў чым не ведалі патрэбы.

● Прайсці паміж маладымі ў царкве — разлучыць іх назаўжды. Таму і пасля вянчання жаніх павінен быў трымаць нявесту за руку на працягу ўсёй святочнай урачыстасці. Лічылася, што падчас вяселля і асабліва да першай шлюбнай ночы паміж маладымі не павінен прайсці ні добры, ні дрэнны чалавек, каб паміж маладымі не ўзнікалі рознагалоссі і сваркі, каб у жыцці мужа не з'явілася «разлучніца», а жонка не глядзела на іншых мужчын.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Аліне Станіславаўне БЯЛЯЕВАЙ з в. Каралішчавічы з нагоды юбілею шчырыя пажаданні моцнага здароўя, дабрабыту, радасці, шчасця, усяго толькі добрага.
Брат Дзмітрый з сям'ёй.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.07	20.15	14.08
Віцебск —	5.53	20.07	14.14
Магілёў —	5.57	20.05	14.08
Гомель —	5.57	19.58	14.01
Гродна —	6.22	20.29	14.07
Брэст —	6.26	20.26	14.00

Месяц

Поўня 24 жніўня.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Васіля, Іпаліта, Максіма, Мікалая, Ціхана.*

К. *МАЦІ БОЖАЙ ЧАНСТАХОЎСКАЙ, Марыі, Тэрэзы, Віктара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Усміхнемся!

Інерцыя. Спякота скончылася, але арганізм па-ранейшаму патрабуе пяць бутэлек піва штодзень.

☺

Узрушаная медсястра забягае ў ардынатарскую і крычыць:
— Доктар! Сімулянт памёр!

☺

Навіны з Іспаніі. Учора падчас карыды на арэну выпаў п'яны рускі турыст — і тарэадору прыйшлося змагацца з двума быкамі!

☺

— На якія льготы мае права ветэран грамадзянскай вайны?
— ?!
— Я быў у грамадзянскім шлюбе 30 гадоў.

☺

Знойдзена галоўная прычына, па якой мужчыны кідаюць жанчын: яны цяжкія.

КАЛІ СТРАШНА І КАЛІ ПРЫГОЖА — КРОК НАПЕРАД!

Куды б ні ступіла нага падарожніка на Маёрцы, там абавязкова знойдзецца, чым наталіць прагу і да прыроды, і да культуры — да ўсяго



Прыгажосць па-іспанску

Галоўная выдатнасць Пальмы — Кафедральны сабор.

Да знаёмства з Маёркай мне падавалася, што краявід з удзелам гор і мора не можа здзівіць — нібыта паўсюль яны аднолькавыя. Дарма што прыгожыя, усё адно — аднолькавыя... Але ж і пашчыравала прырода, ствараючы розны ўзор гэтага Балеарскага вострава! Адсюль і непаўторныя ў сваёй вычварнасці залівы, якія цешаць вока падарожнага і застаюцца ў яго сэрцы назаўсёды. І даўжэзныя, па некалькі кіламетраў, сляпуча белыя пясчаныя косы, якія нібыта гуляюць у даганялкі з морам... І пячоры, якія хвалююць сваёй змрочнасцю.

Не пляжамі аднымі падкупляе Маёрка. Хапае тут і хараства, створанага чалавекам — старадаўнія замкі, крэпасці, храмы... Дзівосных куткоў вострава, куды няблага было б завітаць, — незлічонае мноства. Спынімся толькі на некаторых, дзе трэба пабываць абавязкова!

На іспанскіх пляжах карэспандэнт «Звязды» адчувала сябе да непрыстойнасці... апранутай! Навокал жа ўсе — мужчыны, жанчыны — топлес!

КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛА Ў СКАЛАХ

Бухта **Sa Calobra** — бадай, самае прыгожае месца на свеце. Дарога туды — гэта кіламетры задавальнення, хуткая змена пад'ёмаў і спускаў, калі душу варта шукаць у пятках. Парослыя лесам стромы, дзе здаецца, і нагі не было чалавека, чаргуюцца з самотнымі горнымі вёсачкамі, у якіх людзі жывуць нібыта па-за часам і прасторай — у сваім утульным маленькім свеце. І з шыракэзнымі, шчодра залітымі сонцам, далінамі, дзе нешта аруць, сеюць і жнуць. І з праталінамі вадасховішчаў, якія забяспечваюць вадой сталіцу.

Прыгодніцкая прагулка пешшу да самай прыгожай бухты ў свеце — Sa Calobra.

Самае цікавае пачынаецца, калі пакідаеш аўто (а іх на Маёрцы выбіраюць, здаецца, па прынцыпе «чым менш, тым лепш» — столькі мініяцюрных хэтчбэкаў разам я дагэтуль яшчэ не бачыла) і прабіраешся далей ужо пешшу. Па бугрыстых уцёсах, па завілістым тунэлі, прабітым наўпрост у скале і аздобленым неонавым асвятленнем. На выхадзе — нібыта дзве чашы. Злева — бяздонная, з марской вадой. Справа — неглыбокая, з прэснай. Як добра выйсці з першай, пакрыўшыся шчыльнай салёнай плёнкай, і акунуцца ў другую, да дна прагрэтую сонейкам так, што вада там нібы сыradой! Невялічкі перашыек між імі — лепш за любую ўзведзеную чалавекам канцэртную залу: акустыка пасярод дзвюх высачэзных скал адменная. Кажуць, тут з поспехам ладзяць харавыя выступленні. Не ведаю, як пяецца, а крычыцца там выдатна. Як і скачацца з абрыву ў нерэальна бірузовае бурлівае мора. І кожны раз вусцішна — да паколвання ў пятках — рабіць гэты крок у пустату. Аднак яно таго варта! Па такім прынцыпе і трэба жыць: калі страшна, проста ступаць наперад...

РАЙСКІ КУТОЧАК

Бухта **Portals Vells** — самая ўтульная з тых, што трапляліся мне на вока. Такое адчуванне, што стваральнік рыхтаваў тут для сябе прыватны куточак, дзе можна схавацца ад чужых вачэй, а свае нацешыць багатай палітрай краявідаў. Насамрэч, з кожным грабком плыўцу адкрываецца новы від, зусім не падобны на папярэдні. Спачатку паказваюцца кліфавыя схілы, сасновыя зараснікі, пасля — бяскрайняе мора і велічныя яхты, неўзабаве іх змяняюць старадаўнія руіны. Рэшткі сярэднявечнай вежы, на дзіва, выглядаюць тут вельмі арганічна. Ды і пячорныя ўтварэнні таксама. Пра іх ёсць цікавая легенда. Нібыта стагоддзі таму генуэзскі карабель патрапіў у жудасную буру, і маракі пакляліся, што, калі застануцца жывымі, узвядуць статую Святой Дзевы ў тым самым месцы, дзе іх прыб'е да берага. Пра цудадзейнае выратаванне маракоў я слухаю развесіўшы вушы. З меншым імпэтам успрымаецца дужа падобная да яе легенда пра ўзвядзенне Кафедральнага сабора ў Пальме. Там толькі дзейная асоба іншая (кароль Хайме Першы), і маштаб буйнейшы (ён за сваё выратаванне абяцаў не статую, а цэлы храм), а прынцып той жа... Бура скончылася, абяцанае ўзвялі, з тых часоў і ўшаноўваюць мясцовыя жыхары рэлівію гэтую. Заслона. Не, ну вы паглядзіце, нават фантазіраваць гэтыя іспанцы лянуюцца!

ЦУДАДЗЕЙНАЯ ТРАВА

На райскім пляжы **Portals Vells** мы цешымся матэ — нацыянальным напоем (неалкагольным!) аргенцінцаў. Выраблюць яго з адмысловай, прабачце, «травы» — скрышаных і высушаных лісткоў і маладых парасткаў падуба парагвайскага (хмызнякі ці невялічкія дрэўцы, што растуць у Паўднёвай Амерыцы). Апроч травы для прыгатавання матэ патрэбная яшчэ невялікая чарачка — калебаса. Звонку яна можа быць аздобленая як заўгодна, хоць інкруставаная каштоўнымі камянямі, а знутры абавязкова павінна быць драўлянай. І бамбіша (гэта па-аргенцінску, у класічным іспанскім варыянце — «бамбія», але ж аргенцінцы і Маёрку называюць Машоркай, а купальнік у іх завецца, не паверыце, — маша!) — металічная трубачка з сітцам на канцы, каб усялякія палкі падуба парагвайскага не заміналі спакойна піць матэ. Бамбіша ў ідэале павінна быць са срэбра, з-за яго антыбактэрыяльных уласцівасцяў: усе ж п'юць з аднаго посуду. Так што матэ — напой не для гідлівых. Калі ж закрыць на гэта вочы, то сам цырыманіял цікавы. Гэта напой для добрых шчырых сяброў (памятаем пра дружнасць аргенцінцаў), для цёплай прыемнай кампаніі, для нетаропкай шчырай гутаркі. Першая заварка — для севадора, таго, хто гатуе і падае матэ (дарэчы, аргенцінцы раскрылі мне ўсе сакрэты прыгатавання напою і выправілі ў Беларусь з усімі неабходнымі прыладамі ды кіло матэ, так што ганаровае званне севадора цяпер нашу і я). Астатнія — перадаюцца па коле ў адным і тым жа кірунку, заўжды з рук у рукі. «Дзякуй» севадору кажуць толькі ў адным выпадку: калі не хочуць дабаўкі. Многія параўноўваюць матэ з гарбатай, па мне дык наўрад ці варта рабіць нейкія аналогіі. Матэ — дзівосны, ні на што не падобны. Цудоўна танізуе, ёсць нават інфармацыя, што ён валодае ледзь не супрацьракавымі ўласцівасцямі.

Пад матэ на раз-два разыходзяцца ўсялякія прысмакі. Дарэчы, тыповы аргенцінскі ласунак, які завецца неяк падобна да «малочны слодыч», — гэта наша вараная згушчонка адзін у адзін. Яны ўсё ніяк не маглі паверыць, што тыповы аргенцінскі ласунак ёсць у кожнай беларускай краме. На гэтым падабенствы не заканчваюцца! Тыповая аргенцінская закуска, эмпанадас, — ну вылітыя нашы чабурэкі, толькі дробненькія і пяканыя. Кухня аргенцінская наогул досыць пікантная, тлустая, цяжкая. Можа, таму жанчыны ў іх вельмі мажныя (мужчыны, відаць, шмат працуюць і расходуюць атрыманую энергію, а жанчыны ўсё больш дома, з дзецьмі), і нават мянушка «gordita», пампушачка па-нашаму, іх не крыўдзіць, во як!

Цудадзейны аргенцінскі напой матэ.

СЛЕД ГАЎДЗІ

Уволю наслухаўшыся музыкі хваляў, перамяшчаемся ў Пальму — наталіць культурны голад. І ёсць чым: горад, па астраўных мерках, буйны. 400 тысяч мясцовых жыхароў складаюць амаль палову насельніцтва ўсяго вострава. Галоўныя выдатнасці — Каралеўскі палац Альмудайна і Кафедральны сабор.

Былая рэзідэнцыя ўладароў Маёркі служыць для афіцыйных прыёмаў і сучаснай каралеўскай сям'і. А слаўны Каралеўскі парк з вытанчанымі скульптурамі і фантанамі — для ўцехі турыстаў.

Стандартную легенду пра Кафедральны сабор я паспела вам ужо расказаць, не буду загружаць вас іншымі «цікавымі» фактамі — вы і самі зможаце іх пачытаць у брашурцы, якую ў асветніцкіх мэтах раздаюць ля сабора бясплатна. Ага. Затое за паркоўку здзіраюць грабежніцкія шэсць еўра! Што больш за ўсё ўражвае ў саборы, гэта зусім не гіганцкія яго памеры (120 м у даўжыню, 44 — у вышыню), і нават не тое, што будаваўся ён тры стагоддзі запар. А датычнасць да яго легендарнага Гаўдзі. Заўжды лічыла, што яго шэдэўрамі можна падзівіцца толькі ў Барселоне. Аднак архіепіскап Маёркі таксама быў вялікім прыхільнікам майстра і запрасіў яго да сябе на рэканструкцыю. Гаўдзі падышоў, як заўжды, крэатыўна: змяніў планіроўку, змясціў акцэнты (каб уся ўвага наведвальніка была скіраваная на цэнтральны алтар), дадаў гульні святла — з яго падачы ў Саборы правялі электрычнасць. Ай, ну што тут скажаш, калі за справу бярэцца геній, застаецца толькі глядзець—не наглядзецца і задаволена ўздыхаць...

КАМУ — КАРЫБЫ, А КАМУ — НАРАЧ

Мястэчка **des Trenc** рэкламуецца сціпла: як ці не самы лепшы пляж на Балеарскіх астравах ды і ва ўсёй Еўропе. І на тое ёсць усе падставы: тут сляпуча белы пясок і ўся палітра Айвазоўскага ўжо на прыбярэжнай палосцы вады. Ад празрыста-бірузовага да насычанага ізумруднага, і як толькі вока ўспрымае такую бязліч паўтонаў, дзе ледзь прыкметных, а дзе і вельмі кантрасных пераходаў! Ураджэнцы Карыбаў кажуць, што гэты куток Іспаніі дужа нагадвае ім родныя мясціны. А я па традыцыі знаходжу падабенства са сваёй Радзімай. Мне дык дужа Нарач нагадвае, калі і не багаццем палітры, то неабходнасцю ісці паўгадзіны па калена ў вадзе, перш чым нармальна акунуцца, — беспамылкова!

Мясцовыя жыхары не з'яўляюцца на пляжы без халадзільніка, дзе напоі і ежа застаюцца ў таварным выглядзе, як бы ні прыпякала сонца. А вось ліфад купальніка многія жанчыны лічаць на пляжы лішнім! І адпачываюць топлес. Заўзята скачуць і бегаюць, гуляюць ў палетас (папулярная тут забава, гэткі своеасаблівы пляжны бадмінтон). Не, ну хіба ж я не эстэт?! Вядома ж, я ўмею цаніць прыгожае. Аднак калі бачу на пляжы разнаполую парачку ў аднолькавых белых плаўках, якія цалуюцца-мілуюцца, у мяне з'яўляецца адчуванне, што зараз пачнуцца здымкі порна і час уцякаць! Аднаполыя парачкі, чамусьці пераважна мужчынскія, таксама не саромеюцца самых шчырых праяў пачуццяў на пляжы... Не тое, каб я была пурытанкай... але ж на іспанскім пляжы я чамусьці сябе ёю адчуваю!

РАЗВІТАННЕ З МАЁРКАЙ

Каб сказаць востраву адзьёс, месца, лепшага чым замак Бельвэр, не знайсці. Экзатычны сам па сабе, ён мае нетыповую для гатычнай пабудовы круглую форму і неардынарную гісторыю на сем стагоддзяў. Быў час, калі тут балявалі каралі і знемагалі нявольнікі. Цяпер сюды навезлі ўсялякіх рарытэтаў і зрабілі музей гісторыі Пальмы. У цэнтральным дворыку — сцэна і крэслы для гледачоў, тут ладзяцца сучасныя імпрэзы. А ў паветры — пах даўніны...

Старадаўнія муры замка бачныя, як Эйфелева вежа ў Парыжы, — ледзь не з любога месца горада. І ўсё ўзаемна: з яго адкрываецца проста неймаверны від на Пальму, ды і на востраў наогул. Змаўкаю, бо гэта проста не перадаць словамі...

Не хочацца пакідаць усё гэта дзіва, аднак, як заўжды, раблю крок наперад. Нешта будзе... Будзе Навара, з хэмінгуэеўскімі месцамі, з легендарнымі ўцёкамі ад быкоў, з услаўленым музеем сучаснага мастацтва, з новымі людзьмі, з новымі ўражаннямі...

Ала МАЧАЛАВА,
Маёрка.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЎЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4155 Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12